

# «КАЛІ ТОЛЬКІ МЫ ЗДОЛЬНЫ ПАДСТАВІЦЬ У ЧЫМСЬЦІ ПЛЯЧО ВАШАМУ РЭГІЁНУ, МЫ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ ГЭТА ЗРАБІЦЬ»

**Прэзідэнт правёў сустрэчу з губернатарам Кемераўскай вобласці**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 120 (30508)



# СМУТКУЕМ, ПОМНІМ, ГАНАРЫМСЯ

**Па ўсёй краіне прайшлі маштабныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа**

22 чэрвеня сёлета таксама прыпала на нядзелю, як і 84 гады таму. У гэты дзень Беларусь адзначыла сумную дату — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. Цана перамогі ў той вайне для краіны аказалася вельмі высокай — загінуў кожны трэці жыхар, 3 мільёны толькі чалавечых ахвяр, не лічачы вялікага матэрыяльнага ўрону, які адчуваўся пасля многія дзесяцігоддзі...








«Армады з Захаду прыйшлі забіваць, заваёўваць, паверыўшы ў сваю немагчымасць. Толькі пра адно забыліся. Пра свабодалюбства, адданасць і стойкасць людзей, якія жывуць на гэтай зямлі. І паплаціліся за гэта, — сказана ў звароце Прэзідэнта Беларусі да народа з нагоды сумнай даты. — Лета сорак першага — гэта не толькі пра мінулае. Больш не будзе бліцкрыгаў і вераломных нападаў, бо ўрокі заходняй хлусні мы засвоілі раз і назаўжды. У кожнага пакалення беларусаў свой лёс. Адным суджана змагацца і быць гатовымі аддаць уласнае жыццё за Радзіму. Другім — захоўваць памяць аб ратных подзвігах і не дазваляць агню вайны зноў апаліць палеткі і нівы Айчыны. Зберагчы мір — наш святы абавязак. Мы заўсёды будзем памятаць гераізм бацькоў і дзядоў з глыбокай удзячнасцю за мірнае неба над галавой».

СТАР. 4–5

Фота БелТА.

ЯК ПРАЙШЛО РЭСПУБЛІКАНСКАЕ СВЯТА ВЫПУСКНІКОЎ



8–9

НА СЛЫХУ

## КАСІ, КАСА, ПАКУЛЬ РАСА...

**...і пакуль трава не вырасла да 20 сантыметраў**



Пастанова Савета Міністраў ад 16.05.2025 года № 267 змяніла правілы добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў. Адна з норм, паводле якой неабходна касіць траву на асабістым участку, калі яна вырасла вышэй за 20 см, выклікала вялікі рэзананс ва ўласнікаў загараднай маёмасці.

СТАР. 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!




Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

25120>

9 771990 763008

# «КАЛІ ТОЛЬКІ МЫ ЗДОЛЬНЫ У ЧЫМСЬЦІ ПЛЯЧО ВАШАМУ РЭГІЁНУ, ГАТОВЫ

## Прэзідэнт правёў сустрэчу з губернатарам

Працоўны тыдзень кіраўніка дзяржавы пачаўся з абмеркавання рэгіянальнага ўзаемадзеяння з Расійскай Федэрацыяй. Гэтым разам у эпіцэнтры ўвагі — Кемераўская вобласць, Кузбас. Эканоміка, прамысловасць, сумесныя праекты — далёка не ўсе тэмы, якія з'яўляюцца перспектыўнымі як для Беларусі, так і для гэтага сібірскага рэгіёна.



### «КУЗБАС ДЛЯ НАС БЛІЗКІ»

«Калі вы думаеце, што Сібір для нас — гэта нешта чужое, вы памыляецеся, — звяртаючыся да Ілы Серадзюка, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта роднае, блізкае, зразумелае нам. Яшчэ і таму, што там сёння не зусім шмат, але некалькі тысяч беларусаў жыве. У свой час (хто па сваёй волі, хто — не) з'ехалі туды да вас, і вялікіх праблем, думаю, яны вам там не ствараюць. І таму нам Сібір недалёкая. І Кузбас як жамчужына Сібіры, вядома, для нас блізкі».

Прэзідэнт расказаў пра сваю паездку ў рэгіён у канцы 1990-х гадоў, калі Кузбасам кіраваў Аман Тулееў. Тады абмяркоўвалі праблему пэўнай дарагавізны беларускай тэхнікі. «Ён мне шчыра казаў: «Неяк дарагавата, але я ведаю, чаму». Я кажу: «Ёсць магчымасць гэта вельмі проста вырашыць. Давай дамовімся, Аман: я табе прывожу сюды па цэнах Беларусі тэхніку, а далей ты прадавай, каму палічыш патрэбным, і забірай гэту нацэнку ад гандлю і гэтак далей, але тады да мяне прэтэнзій не будзе».

**По словах кіраўніка дзяржавы, праблема пасрэдніцтва да канца не вырашана і дагэтуль. «Пасрэднікі былі і ёсць, але яны не павінны быць нядобрасумленнымі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце, куды іх грошы сыходзяць, і нацэнкі яны робяць не малыя. Таму, калі ёсць такая неабходнасць, мы са свайго боку вельмі жорстка кантралюем цэны».**

Тым больш, як акцэнтаваў увагу Прэзідэнт, усе буйныя кампаніі, якія гандлююць з Кузбасам, з'яўляюцца дзяржаўнымі: яны кіраваныя і разумеюць мэту двухбаковых узаемадносін. «Гэта важна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і ўнёс прапанову ўзяць дадзенае пытанне пад кантроль беларускім бокам.

### «ПАЎМІЛЬЯРДА СТАБІЛЬНА МЫ МОЖАМ МЕЦЬ ТАВАРААБАРОТ»

У Кемераўскай вобласці шырока выкарыстоўваецца беларуская тэхніка. Аднак, нягледзячы на гэта, апошнім часам тавараабарот знізіўся.

**Даслоўна**

### «Патэнцыялу і кампетэнцый у беларускіх калег і Кузбаса дастаткова»

У размове з журналістамі **Ілья СЕРАДЗЮК** адзначыў, што Кузбас бачыць аснову далейшага эканамічнага росту з Беларуссю ў стварэнні сумесных праектаў па распрацоўцы і вырабе новых відаў тэхнікі. «Не толькі набыццё ўжо выраблевай прадукцыі, але і распрацоўка новых узораў, што могуць прыйсці ўзамен тэхніцы (напрыклад па абслугоўванні гарналыжных схілаў), якую сёння не вырабляюць ні ў Расіі, ні ў Беларусі, — канкрэтызаваў ён. — Патэнцыялу і кампетэнцый у дадзенай сферы ў беларускіх калег і Кузбаса дастаткова, каб мы маглі гэта развіваць».

Ілья Серадзюк адзначыў, што такой новай прадукцыяй могуць стаць ратракі — спецыялізаваныя гусенічныя машыны для падрыхтоўкі гарналыжных схілаў і лыжных трас. Кузбас актыўна развівае гарналыжны турызм, і такія машыны патрэбны рэгіёну. «У нашых краін дастаткова кампетэнцый для таго, каб асвойваць тэхніку, якую сёння завозім з іншых тэрыторый, — удакладніў Ілья Серадзюк. — Шмат такіх пазіцый: і сельскае машынабудаванне, якое можа ў нас развівацца. Але самае галоўнае, ключавое, што мы сёння ўжо рэалізоўваем, — мультыбрэндавы сэрвісны цэнтр па тэхнічным абслугоўванні беларускіх машын. Прадугледжана арганізаваць вялікі склад запчастак і наладзіць работу мабільных брыгад, якія пры неабходнасці змогуць абслугоўваць тэхніку на месцах з мінімальным спыненнем тэхналагічнага працэсу».

Губернатар дадаў, што за шэсць гадоў Кемераўская вобласць купіла больш як 1,4 тысячы машын горназдабыўнога абсталявання з Беларусі. «Тавараабарот за апошнія шэсць гадоў перасягае 2,5 мільярда долараў, — канстатаваў ён. — З Аляксандрам Рыгоравічам мы абмеркавалі неабходнасць пашырэння нашых адносін».

Кіраўнік расійскага рэгіёна расказаў, што недалёка ад пасёлка Шарагеш, які вядомы сваім гарналыжным курортам, плануецца пабудаваць новы аэрапорт. Ён лічыць перспектыўным адкрыццё прамога авіярэйса, які б дастаўляў аматараў гарналыжнага адпачынку ў Кузбас. У сваю чаргу, заўважыў губернатар, жыхары Кемераўскай вобласці скарыстаюцца запрашэннем пабываць у памятных мясцінах Беларусі.

Дарэчы, Ілья Серадзюк упершыню ў нашай краіне. Ён вельмі ўражаны развіццём інфраструктуры і дагледжанасцю беларускіх гарадоў, а таксама звярнуў увагу на добраўпарадкаванне памятных мясцін і ваенных пахаванняў. На сустрэчы з Прэзідэнтам губернатар падзяліўся сямейнай гісторыяй. Каля вёскі Філіпавічы Мінскай вобласці ў 1942 годзе загінуў яго стрыечны дзед. Знаходзячыся ў Беларусі, Ілья Серадзюк наведаў абеліск у гонар воінаў і партызан, размешчаны ў гэтым населеным пункце, і ўшанаваў памяць свайго дзеда, усіх савецкіх воінаў, якія аддалі жыццё за Радзіму. Губернатар адзначыў, наколькі трапятліва мясцовыя жыхары ставяцца да ўтрымання гэтых помнікаў. Усе мемарыяльныя мясціны, невялічкія магілы, якія ён сустракаў па дарозе, таксама дагледжаныя, што зрабіла на кіраўніка Кузбаса вялікае ўражанне. Па яго словах, вельмі важна займацца захаваннем гістарычнай памяці, патрыятычнай работай.

# ПАДСТАВІЦЬ МЫ ЗАЎСЁДЫ ГЭТА ЗРАБІЦЬ»

## Кемераўскай вобласці

«Паўмільярда стабільна мы можам мець тавараабарот, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — І мы ад гэтага адыходзіць не павінны. Я разумею складанасці і цяжкасці, аб якіх кажуць сёння ўсе (толькі лянівы не кажа): вось у Расіі — і стаўкі, і тое, і іншае. Заўсёды можна на нешта спаслацца. Але калі мы паставім перад сабой мэту — пераўзысці ўсё гэта,ніверлітараваць — мы гэта можам зрабіць».

На Кемераўшчыне вельмі запатрабаваны беларускія самазвалы БЕЛАЗ. Як звярнуў увагу беларускі лідар, і для БЕЛАЗаў, і для іншай тэхнікі Кузбас з'яўляецца своеасаблівым выпрабавальным палігонам. «Самыя перадавыя ўзоры БЕЛАЗаў мы пастаўляем да вас, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Там яны праходзяць апрабацыю, у тым ліку і беспілотныя, і газаматорныя. Мы ў гэтым плане працягнем з вамі працаваць, але ёсць праблема, якую нам з вамі трэба вырашыць. Гэта мультыбрэндавыя цэнтры, якія вы стварылі ў Кузбасе. Так, БЕЛАЗы ў асноўным прадаюцца. Але там выстаўлена ўся тэхніка: і МАЗ, і МТЗ, і «Белкамунмаш», і сельскагаспадарчая прычэпная тэхніка».

Па словах кіраўніка дзяржавы, Беларусь гатова шырэй супрацоўнічаць з тым рэгіёнам, дзе размешчаны Кузбас. «Гэта палова Сібіры фактычна, густанаселенай Сібіры, — удакладніў ён. — Давайце падумаем разам, як згаданы цэнтр задзейнічаць такім чынам, каб ён аб'ёмы свае павялічваў. Яшчэ раз падкрэсліваю: мы да гэтага гатовы.

**Мы гатовы гандляваць з вашымі кампаніямі, якія набываюць у нас машынабудаўнічую, іншую прадукцыю з пэўнымі прэферэнцыямі, у тым ліку і па лізінгу. Адзінае, нам у гэтым плане патрэбны гарантыі. Гарантыі — гэта сумленна. Каб мы паставілі па лізінгу — і аплата была. Бо мы дзясяткі мільёнаў долараў страцілі ў Расіі, калі супрацоўнічалі без гарантый невядома з якімі кампаніямі. Яны развальваліся, сыходзілі, а потым генеральныя пракуроры Расіі і Беларусі па ўсёй Расіі (дзякуй пракуратуры Расіі) шукалі гэтых людзей для таго, каб прыцягнуць да адказнасці. Гэта не справа. Таму нам патрэбны гарантыі».**

Акрамя таго, падчас сустрэчы абмяркоўвалася пытанне паставак пасажырскай тэхнікі з Беларусі. «Тралейбусы, аўтобусы, аўтобусы электрычныя — яны ў нас ужо выпрабаваны, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яны звязваюць гарады, прайшлі выпрабаванні вельмі добра. Калі вас гэта цікавіць, можам і тут падключыцца».

Што датычыцца паставак сельскагаспадарчай тэхнікі, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў нашай краіне вырабляецца ўвесь шлейф сельгастэхнікі (ад пасяўной да ўборачнай), якая пераўзыходзіць аналагі замежнай. У поўным аб'ёме ў Беларусі выпускаецца і камунальная тэхніка: у гэтым кірунку наша краіна таксама гатова супрацоўнічаць больш шчыльна.

«Калі вас гэта задавальняе, мы з вамі гатовы працаваць у галіне насенняводства, племяннога развядзення жывёлы, па іншых кірунках, у тым ліку па бульбаводстве (у нас цэлы інстытут, і мы няўдрэнна працуем па насенні і новых сартах іншых культур), — адзначыў Прэзідэнт. — Наогул, спектр адносін — вялізны. Калі толькі мы здольны падставіць у чымсьці плячо вашаму рэгіёну, заўсёды гатовы гэта зрабіць».

### «ГЭТА ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ І ЎКАРАНЕННЯ НА НАШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ»

«Нас звязваюць вельмі працяглыя, добрыя адносіны, — канстатаваў губернатар Кемераўскай вобласці. — Тая тэхніка, якую вы пералічвалі, актыўна выкарыстоўваецца ў рэгіёне. Мы ўсе цудоўна ведаем і дарожную тэхніку «АМКАДОР», якая ў зімовых умовах дапамагае нам снег прыбіраць. Гэта і камунальныя, і сельскагаспадарчыя машыны. Каля 10 % нашых збожжаўборачных камбайнаў — беларускай вытворчасці».

Кіраўнік расійскага рэгіёна праінфармаваў, што напярэдадні дэлегацыя Кемераўшчыны азнаёмілася з навінкамі «Гомсельмаша», у выніку чаго былі ацэнены перспектывы павелічэння паставак гэтай тэхнікі. Акрамя таго, абмяркоўваецца пытанне павелічэння паставак прадукцыі МАЗа на рынак Кузбаса, у цэлым Расійскай Федэрацыі.

Даўнім партнёрам Кемераўскай вобласці з'яўляецца ААТ «БЕЛАЗ». Падчас гэтага візіту дэлегацыя Кузбаса наведала прадпрыемства. Ілья Серадзюк адзначыў высокую культуру вытворчасці. «Мы азнаёміліся, у якіх умовах працуюць работнікі прадпрыемства і якія сацыяльныя гарантыі дадзены ім, — удакладніў ён. — Гэта таксама прыклад для пераймання і ўкаранення ў нас на тэрыторыях, на нашых прадпрыемствах — сацыяльная адказнасць перад тымі людзьмі, якія прыходзяць працаваць». Акрамя таго, прадстаўнікі Кемераўскай дэлегацыі ўражаны праграмай выдзялення жылля маладым спецыялістам.

Па словах губернатара, Кемераўская вобласць наладзіла тавараабарот з 89 краінамі свету. «Тавараабарот знешняга гандлю з Рэспублікай Беларусь, нягледзячы на тое, што мы знаходзімся на дастаткова аддаленай адлегласці, займае 14 месца, — сказаў ён. — Мы пастаўляем вугаль, прадукцыю металургіі, прадукты харчавання. Адсюль мы набываем высакаякасную тэхніку вытворчасці «АМКАДОР», МАЗа, МТЗ і БЕЛАЗа».

**Вераніка КАНЮТА**
**Фота БелТА.**

# У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАЙ РАЗМОВЫ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са спецыяльным пасланнікам Прэзідэнта ЗША па Украіне Кітам Келагам

Размова прайшла ў мінулую пятніцу ў Палацы Незалежнасці з удзелам членаў дэлегацый.

На парадку дня перагавораў былі міжнародная праблематыка і ў цэлым сітуацыя ў свеце, рэгіянальная тэматыка і беларуска-амерыканскія адносіны.

«Шуму вы нарабілі ў свеце вельмі шмат сваім прыездам, але я здзіўляюся, чаму. Хіба мы не можам весці нармальны дыялог і разважаць пра нашы справы — пра адносіны паміж Беларуссю і Злучанымі Штатамі Амерыкі?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Вельмі рады сустрэцца з вамі. Я спадзяюся, што наша размова будзе вельмі шчырай, адкрытай. У адваротным выпадку чаго сустракацца? Калі мудрагеліць, хітраваць адзін перад адным, мы выніку не даб'ёмся», — падкрэсліў беларускі лідар.

У сваю чаргу Кіт Келаг падзякаваў за гасціннасць і сустрэчу. «Мы жывём у вельмі небяспечны час, калі тыя крызісы, з якімі мы сутыкаемся, могуць рэзка эскаліраваць, разрастацца, калі мы не будзем мудрымі і справядлівымі», — сказаў ён.

У адказ на гэта Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Спадар генерал, я вам абяцаю, што вы будзеце ў поўнай бяспецы на тэрыторыі Беларусі, і за гэты час не адбудзецца ніякай эскалацыі не толькі ў Беларусі, але і вакол нас».



**Спецпасланнік Трампа Кіт КЕЛАГ** адзначыў паспяховыя перагаворы ў Мінску. Ён таксама распавёў, што абмяркаваў з Прэзідэнтам Беларусі СВА, а таксама намаганні, якія прыкладае Трамп для спынення ваенных дзеянняў на Украіне.

«Дзякуй, Джэйсан Мілер. У цэлым выдатная камандная праца. Наша дэлегацыя сустрэлася з лідарам Беларусі, Лукашэнкам, і яго камандай. Джон Коўл узначаліў абмеркаванне двухбаковых адносін паміж ЗША і Беларуссю», — напісаў Келаг у сацыяльнай сетцы X.

***



Як расказала ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» **прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ,** размаўлялі беларускі лідар і спецпасланнік Прэзідэнта ЗША шэсць з паловай гадзін. Спачатку ў рабочым кабінеце Прэзідэнта, затым за вячэрай. А завяршылася сустрэча ўжо ноччу. Атмасферу і характар размовы добра відаць па кадрах, якія ўжо былі днём апублікаваныя. Кола тэм — максімальна актуальнае. Гаварылі аб тым, што цяпер хвалюе ўвесь свет», — адзначыла прэс-сакратар.

Паводле яе слоў, у тым ліку размаўлялі аб Украіне і Блізкім Усходзе, аб узаемадзеянні Беларусі з Расіяй і Кітаем, аб санкцыйнай палітыцы ЗША і ЕС у адносінах да Беларусі, Расіі і іншых дзяржаў. Гаварылі таксама аб змяненнях у палітычнай архітэктуры свету, аб людзях і гісторыі войнаў.

«Што датычыцца падрабязнасцяў размовы, дэталяў, нюансаў, яны дасканала вядомы, зразумела, толькі тым, хто прысутнічаў на гэтых перагаворах», — дадала Наталля Эйсмант.

Яна паведаміла, што Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб памілаванні 14 асуджаных. Гэта была просьба Прэзідэнта ЗША.

«У асноўным гэта іншаземцы: 2 грамадзяніны Японіі, 3 грамадзяніны Польшчы, 2 — Латвіі, а таксама грамадзяне Эстоніі, Швецыі і ЗША. У спісе і некалькі беларусаў. Гэта асобы, асуджаныя за экстрэмісцкую і тэрарыстычную дзейнасць», — адзначыла Наталля Эйсмант, словы якой прыводзіць Telegram-канал «Пул Першага».

«Сяргей Ціханоўскі ў тым ліку. Рашэнне аб вызваленні Ціханоўскага было прынята Прэзідэнтам выключна з гуманных меркаванняў, з мэтай уз'яднання сям'і», — заявіла прэс-сакратар.

### Даслоўна



«Гэта далёка не першая сустрэча, якую Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка праводзіць з амерыканскімі дэлегацыямі, — адзначыў **пастаянны прадстаўнік Беларусі ў ААН Валянцін РЫБАКОЎ,** які прымаў удзел у сустрэчы. — Што датычыцца змястоўнай часткі, абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з канфліктамі, войнамі, абмяркоўваўся Блізкі Усход. Зразумела, абмяркоўвалася наша рэгіянальная сітуацыя — Расія, Украіна, Беларусь, — сказаў Валянцін Рыбакоў. — Адміністрацыя ЗША ўсведамляе месца і ролю Беларусі ў рэгіянальнай сітуацыі, поўнасцю разумее тое, якой палітычнай вагой і палітычным вопытам валодае Прэзідэнт Беларусі. Менавіта таму і былі прыняты рашэнні і аб павышэнні ўзроўню дэлегацыі, таму што папярэдняя дэлегацыя прыязджала на больш нізкім узроўні. Вопыт, якім дзеліцца Прэзідэнт Беларусі з амерыканцамі наконт канфлікту з улікам яго асабістай уключанасці, яго выдатнага ведання кіраўнікоў дзяржаў, аб якіх ідзе размова, — усё гэта высока цэніцца Адміністрацыяй».

«Пазіцыя, якую падкрэслівае на кожнай такой сустрэчы Прэзідэнт Беларусі, нязменна ў тым, што наш рэгіянальны канфлікт неабходна як мага хутчэй спыніць», — адзначыў дыпламат. Валянцін Рыбакоў таксама заўважыў, што Беларусь уносіць магчымы неабходны ўклад у тое, каб людзі перасталі гінуць. «Амерыканскі бок высока цэніць тую дапамогу, якую Беларусь аказвае. Натуральна, размова на такіх сустрэчах ідзе і пра двухбаковыя адносіны», — сказаў ён.



**Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ** адзначыў, што розныя сустрэчы і кантакты ў кіраўніка беларускай дзяржавы ёсць не толькі з амерыканскім бокам. «Думаю, што час потым будзе паказаць і іншыя аспекты, але з амерыканскім бокам вось такога выніку мы дасягнулі, — сказаў ён. — Мерапрыемства, якое было гэтымі днямі, толькі адно з вельмі-вельмі многіх. Кантакты ў кіраўніка дзяржавы, у тым ліку на самым высокім, на высокіх узроўнях з іншымі краінамі ёсць. І іх шмат. І, вядома, пакуль не час пра іх гаварыць, але потым мы раскажам».

Што датычыцца падрыхтоўкі сустрэчы і рашэння аб памілаванні, Іван Тэртэль расказаў, што Аляксандр Лукашэнка вельмі ўважліва падыходзіў да ўсіх аспектаў: «Мы разумеем, што крытэрыі, якімі кіраваўся кіраўнік дзяржавы, былі перш за ўсё гуманітарнымі. Мы ведаем падыход нашага Прэзідэнта. Гэта найперш інтарэсы сям'і, непаўналетніх дзяцей. Мы ведаем, што ў тых асоб, якія былі ў спісе, ёсць сур'ёзныя праблемы — і сямейныя, і асабістыя ў гэтых адносінах. І трэба іх улічваць». Другі аспект — неабходнасць развіваць добрасуседскія адносіны з рознымі краінамі, каб садзейнічаць дээскалацыі сітуацыі, якая існуе. У тым ліку таму, паводле слоў старшыні КДБ, было прынята рашэнне аб памілаванні асоб, сярод якіх шмат і замежных грамадзян розных дзяржаў.

# СМУТКУЕМ, ПОМНІМ,

## КРЭПАСЦЬ — САКРАЛЬНАЕ МЕСЦА

Зварот кіраўніка дзяржавы зачытаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой падчас канцэрта-рэквіема «4 гады доўгага шляху», які сабраў на досвітку 22 чэрвеня ў Брэсцкай крэпасці каля 35 тысяч чалавек.

...Адным з самых шчымлівых і эмацыянальных момантаў начных мерапрыемстваў у крэпасці заўсёды становіцца спусканне вянкоў па Бугу, якое праводзяць вартавыя граніцы. У памяць аб загінулых па даўняй традыцыі спускаюцца вянкі з запаленымі свечкамі на воды Заходняга Буга. Іх пранеслі і апусцілі ў раку сённяшнія вайскоўцы, равеснікі тых, хто стаяў насмерць у 1941-м. Вайскоўцы таксама ўсклалі гірлянды да пліт мемарыяла, а юнакі і дзяўчаты паставілі запаленыя лампадкі.

Удзельнікамі канцэрта-рэквіема сталі беларускія і расійскія артысты. На сцэне мяняліся карцінкі, дэманструючы розныя эпізоды вайны: спачатку мірны і бесклапотны дзень 21 чэрвеня, затым вераломны напад, мітусню і паніку вакзалаў, барацьбу з ворагам, страты і пошукі родных, вызваленне. Дзве гадзіны дзеі ішлі нібы на адным дыханні, завалодаўшы ўвагай гледача.

На Кобрынскім умацаванні тым часам пачыналася ваенна-гістарычная рэканструкцыя. Тэатралізаваная дзея на полі стала лагічным працягам мерапрыемстваў на плошчы Цырыманіялаў. У ёй прымалі ўдзел больш за 600 рэканструктараў з розных краін. Паглядзець на адноўленыя падзеі 1941-га сабраліся дзясяткі тысяч гледачоў.




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## ПАМОЛІМСЯ І ПАМАЎЧЫМ...

**Усебеларуская малітва за мір** прагучала раніцай 22 чэрвеня ва ўсіх храмах Беларусі і завяршылася ў 12.00 агульнанацыянальнай хвілінай маўчання. Краіна застыла ў журботным аняменні. У эфіры ТБ і радыё, у воінскіх калектывах, на вуліцах, плошчах і іншых грамадскіх месцах краіны тужлівым рэхам прагучалі ўдары метранома і мелодыя рэквіема.

У гэты ж час ва ўсіх храмах быў дадзены набат званоў, а на транспарце прагучалі сігнальныя гудкі. У некаторых месцах быў прыпынены рух.

Жалобныя мерапрыемствы адбыліся ў Мінску **ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец»** каля манумента «Брама памяці». **Жыхары Віцебска** ўсіх узростаў таксама аддалі даніну памяці ахвярам крывапралітнай вайны. Мітынг-рэквіем на Успенскай горцы сабраў прадстаўнікоў розных прафесій і ўзростаў. Нямала прыйшло і сем'яў, у тым ліку з маленькімі дзецьмі.

# МАБІЛЬНАЯ КАМАНДА ПАТРЫЁТАЎ

### З Брэста стартаваў чарговы «Цягнік Памяці»

У Брэсце памятныя мерапрыемствы пачаліся ўжо ў суботу з самага ранку. А ў поўдзень на брэсцкім вакзале сабралася шмат людзей, каб сустрэць «Цягнік Памяці». Гэты ўнікальны праект упершыню стартаваў тры гады таму, таксама 21 чэрвеня, у Брэсце. Тады пасажырамі цягніка сталі дзве сотні беларускіх і расійскіх школьнікаў, цяпер геаграфія ўдзельнікаў праекта значна пашырылася — далучыліся хлопцы і дзяўчаты з іншых рэспублік былога СССР.

Разам яны праедуць па 15 гарадах Беларусі і Расіі і наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, возьмуць удзел у тэматычных сустрэчах, убачаць многія славутасці, культурныя, гістарычныя аб'екты. А галоўнае — пазнаёмяцца, будуць шмат камунікаваць, абменьвацца думкамі і меркаваннямі.

У канферэнц-зале Брэсцкага аблвыканкама адбылася афіцыйная частка сустрэчы «Цягніка Памяці» ў выглядзе дыялогавай пляцоўкі. Перад яе пачаткам была арганізавана выстаўка здымкаў з папярэдніх праектаў. Паказалі невялікі, але кранальны відэасюжэт з «Цягніка Памяці» 2024 года.

Дыялогавая пляцоўка прайшла надзвычай ажыўлена. На пытанні школьнікаў адказвалі **кіраўнік Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, віцэ-спікер Савета Федэрацыі Канстанцін КАСАЧОЎ** (дарэчы, менавіта па ініцыятыве кіраўнікоў Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі і распачаўся гэты ўнікальны праект), **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК, міністр адукацыі нашай краіны Андрэй ІВАНЕЦ.**

Наталля Качанава звярнулася да ўдзельнікаў праекта з пранікнёнымі словамі: «Памятайце гісторыю, якая звязала нашы краіны! Мы павінны быць разам. Нас аб'ядноўваюць агульнае мінулае, агульныя каштоўнасці, агульная боль і агульная Перамога». Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што савецкі народ разам здабываў перамогу, усе народы, людзі ўсіх нацыянальнасцяў былі адной сям'ёй: «Вы — нашчадкі пераможцаў, нашчадкі тых людзей, якія цаной жыцця адстаялі свабоду, абаранілі сваіх родных і блізкіх». «...Старэйшае пакаленне шчаслівае тым, што ў сэрцах маладых жыве памяць», — дадала Наталля Качанава.

Пётр Пархомчык падкрэсліў асаблівую ролю Брэста: «Мы ў Брэсце зберагаем гэтую памяць... Наш абавязак — спрыяць сувязі пакаленняў на шляху захавання памяці». Кіраўнік Брэстчыны расказаў, якая роля ў гэтай справе адводзіцца








# ГАНАРЫМСЯ



**На Буйніцкім полі пад Магілёвам** у Дзень усенароднай памяці прайшла традыцыйная акцыя «Звон смутку». Тут сабраліся тысячы чалавек, каб ушанаваць памяць тых, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны адстойваў правы беларусаў жыць на сваёй зямлі, і ўсіх тых, хто загінуў ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут жа быў дадзены старт міжнароднаму маладзёжнаму праекту «Дарогамі памяці і славы».

Тысячы агнёў памяці запалілі жыхары **Гомельскай вобласці** ў перадсвітальны час 22 чэрвеня. Хвіліна памяці — жывыя кветкі і вянкі ляглі да мемарыялаў, таксама ў асобных раёнах апусцілі на ваду вянкі смутку, са свечак і лампад склалі словы «Помнім», «Не забудзем», а ў Гомелі сёлетнія выпускнікі запусцілі паветраныя шары ў мірнае перадсвітальнае неба.

З году ў год роўна ў 4.00 ваеннаслужачыя, прадстаўнікі органаў улады, грамадскіх аб'яднанняў і проста неабыякавыя жыхары **горада Гродна** збіраюцца разам каля помніка савецкім воінам-пагранічнікам на вуліцы Паповіча, каб аддаць даніну памяці. А ўвечары ў Парку Жылібера каля Вечнага агню прайшла маштабная акцыя «Памяць».

**Паводле паведамленняў нашых карэспандэнтаў.**













Рэспубліканскаму цэнтру патрыятычнага выхавання моладзі, што нядаўна пачаў сваю работу і адразу становіцца міжнародным, бо ўжо ў гэтым годзе сюды прыедуць групы юнакоў з Іркуцкай і Пензенскай абласцей. Тэму падхапілі ўдзельнікі дыскусіі, спыталі губернатара, як трапіць на адпачынак у цэнтр.

...Пытанняў было шмат. Школьнікі расказвалі пра гісторыі сваіх родных, пыталіся пра асабістае ў дарослых удзельнікаў дыялогу.

***

*А перад пачаткам падарожжа ўдзельнікі праекта падзяліліся ўражаннямі і чаканнямі.*

Пасажырка «Цягнікі Памяці» Дар'я Курманская адзначыла, што чакае ад падарожжа шмат новых, шчырых эмоцый. «Хочацца адчуць дыханне гісторыі, адчуць усю працу і подзвіг нашага народа. Я чакаю мора новых прыгод, новых і цікавых знаёмстваў, і я ў прадчуванні, — сказала яна. — Мы размаўлялі з удзельнікамі першага «Цягніка Памяці», з удзельнікамі мінулага года, яны нам расказвалі пра свае падарожжы, уражанні, ім вельмі ўсё спадабалася. І я спадзяюся, што ў нас таксама ўсё пройдзе вельмі класна, вельмі выдатна, і мы атрымаем неймаверны досвед, які дапаможа ў будучыні. Лічу, што гэта неверагодная магчымасць унесці асабісты ўклад у захаванне гістарычнай памяці: павага да мінулага — наша ўсё».

Марыя Андрэева таксама ў прадчуванні. «Чаканні вельмі вялікія, хочацца атрымаць мора ўражанняў, знайсці мноства новых сяброў. У мяне ёсць знаёмыя, якія былі ўдзельнікамі мінулых сезонаў, яны ўсе прыязджалі з вагонам новых эмоцый, уражанняў. Знаёмыя з розных краін з'яўляюцца, і яны працягваюць камунікаваць, дзяліцца, і гэта незабыўна», — сказала ўдзельніца праекта.

Яе сяброўка Надзя Карыэр дадала: «Я хачу ўбачыць на свае вочы месцы, пра якія нам расказваюць на ўроках гісторыі, пагутарыць з людзьмі, абмяняцца вопытам. На мой погляд, удзел у культурна-адукацыйным праекце «Цягнік Памяці» мае вялікае значэнне ў захаванні гістарычнай памяці і выхаванні патрыятызму».

«Мы ўсе шмат ведаем пра гісторыю вайны, безумоўна, менавіта тэарэтычную частку з кніг. А паездка дазволіць нам убачыць гэта ўсё на свае вочы, адчуць дух тых падзей. Таксама каштоўныя новыя знаёмствы. У мяне шмат сяброў, якія ездзілі ў мінулыя гады, і іх яркія пасля праекта аповеды пра тое, як гэта крута, настолькі мяне натхнілі, што я зразумела: абавязкова павінна трапіць сюды і не ўпусціць гэтую магчымасць», — сказала Арына Мамедава.

## Аўтавелапрабег у гонар герояў



Гэтымі днямі па Беларусі праходзіў і Міжнародны патрыятычны аўтавелапрабег. Яго ініцыятары — спартыўныя таварыствы «Дынама» Беларусі і Расіі. Аўтавелапрабег стартаваў 17 чэрвеня і завяршыўся 23-га. Маршрут удзельнікаў пралёг праз Маскву, Валакаламск, Ржэў, Вязьму, Смаленск, Віцебск, Магілёў, Мінск, Хатынь. Старшыня цэнтральнага савета БФСТ «Дынама» Дзмітрый БАЛАБА падкрэсліў: «Мы праводзім гэты аўтавелапрабег у памяць аб нашых дзядах, аб тых, хто калісьці заваяваў Перамогу. І мы, сапраўдныя патрыёты, дынамаўцы, разам у адзіным патрыятычным парыве праязджаем па памятных мясцінах, — сказаў ён. — Сёння ў Еўропе, ды і ў цэлым у свеце, ёсць спробы перапісаць гісторыю. Але мы памятаем і ведаем, як гэта было. Мы памятаем і шануем памяць герояў, дзякуючы якім жывём пад мірным небам».

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Пинский автобусный парк», Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111, УНП 200298320 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – автобусы (б/у), по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111**

| № лота | Марка, модель, регистрационный знак, год выпуска | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автобус МАЗ 152062,** № кузова Y3M15206280000462, рег. знак АВ 2921-1, 2008 г. в. | 17 640,00 |
| 2 | **Автобус-вагон МАЗ 256170**, рег. знак АЕ 6857, 2006 г. выпуска | 21 120,00 |
| 3 | **Автобус-вагон МАЗ 256170**, рег. знак АЕ 7588, 2006 г. выпуска | 21 120,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

По лоту № 1 – 5 (пять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи.
По лотам № 2 и № 3 – 25 % стоимости объекта осуществляется не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи, оставшиеся 75 % стоимости объекта оплачиваются ежемесячно равными долями в течение 6 месяцев с момента передачи объекта

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.04.2025 и 19.09.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 07.07.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 02.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Потсдам», г. Лида, Гродненская обл., г. Лида, ул. Летная, 4 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронных торгов (имущество, реализуемое одним лотом)

**Здание кафе «Полюс»** (инв. № 420/С-4701, общ. пл. 533,3 кв. м) по адресу: Гродненская обл., ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 1.*** Сост. части и прин-ти: в – водопроводная сеть, а – канализационная сеть, б – тепловая сеть, г – сооружение благоустройства. ***Обременение:*** договор аренды. **Здание пункта приема стеклотары** (инв. № 420/С-4740, общ. пл. 76,1 кв. м) по адресу: Гродненская обл., ***г. Лида, ул. 3-я Куйбышева, 3***. Сост. части и прин-ти: Б1/к – склад, В1/к – склад, (Б1/к) – погреб, а – сооружения благоустройства. В состав лота входит иное имущество, подробнее ознакомиться можно на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Сведения о земельных участках: 1** – общ. пл. 0,1640 га предоставлен продавцу для размещения объектов общественного питания на праве постоянного пользования. **2** – общ. пл. 0,0283 га предоставлен продавцу для обслуживания пункта приема стеклотары на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 524 083,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение и затраты за проведение независимой оценки продавцу, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 09.07.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**


# БЯСПЕКА ДЗЯЦЕЙ, ЗАБЯСПЕЧАНАСЦЬ СТАБФОНДАЎ, ВАЖНАСЦЬ АЎДЫТУ

## У Палаце прадстаўнікоў прынялі шэраг важных законапраектаў

У Авальнай зале Дома ўрада адбылося пасяджэнне другой сесіі Палаты прадстаўнікоў. На ім былі разгледжаны пытанні рэгулявання грамадскіх адносін, прыняты важныя законапраекты. Сярод іх — прававая абарона правоў і законных інтарэсаў дзяцей, развіццё міждзяржаўных адносін, забеспячэнне харчовай бяспекі, удасканаленне аўдытарскай дзейнасці.



Фота БелТА.

### АБАРАНІЦЬ ДЗЯЦЕЙ АД ЦАЦАК

Абарона правоў і інтарэсаў дзяцей заўсёды была і застаецца адной з найважнейшых задач нашай дзяржавы, заявіла **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Святлана АДЗІНЦОВА.** «Мы імкнёмся забяспечыць іх якаснае, усебаковае развіццё, адукацыю, выхаванне, і самае галоўнае — каб усё гэта адбывалася ў абстаноўцы, бяспечнай для жыцця і здароўя кожнага маленькага грамадзяніна нашай краіны. Усё гэта робіцца з разуменнем: ад таго, якім будзе падрастаючае пакаленне, залежыць будучыня краіны.

> **Павысіць эфектыўнасць мер, якія прымаюцца дзяржавай, па абароне правоў дзяцей заклікаНы праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей».**

Ключавое месца ў праекце займаюць нормы, якія прадугледжваюць стварэнне дадатковых прававых механізмаў, якія ўзмацняюць гарантыі рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў дзяцей ва ўсіх сферах іх жыцця. Значная ўвага ўдзяляецца ўдасканаленню абароны дзяцей ад інфармацыі, якая наносіць шкоду іх здароўю і развіццю», — расказала яна.

Па вялікім рахунку гэты заканадаўчы акт — адказ на тыя выклікі, якія сёння адчувае неакрэплае маладое пакаленне, упэўнены **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерый МАЛАШКА.** «У першую чаргу гэтыя выклікі ляжаць у інфармацыйнай бяспецы. Навелы закона прадугледжваюць адказнасць бацькоў за абарону ад дэструктыўнага ўплыву інтэрнэту. Яшчэ адна важная навела абароніць дзяцей ад цацак. У першую чаргу гэта тыя цацкі, якія з'яўляюцца прайграваннем камп'ютэрных гульняў і фільмаў, тыя вобразы, якія чужыя нашаму ўспрыманню і дэструктыўна ўздзейнічаюць на псіхіку і здароўе дзіцяці. Маркіруючы гэтыя цацкі ў адпаведнасці з узростам, мы даём права выбару бацькам набываць альбо не набываць іх», — рэзюмаваў ён. Законапраектам таксама прадугледжана, што наймальнікі, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі маюць права арганізоўваць і праводзіць псіхалагічнае сумоўе з асобамі, якія плануюць пастаянна працаваць ці ўжо працуюць з дзецьмі.

### БУДЗЕМ З БУЛЬБАЙ!

Пытанні харчовай бяспекі нашай дзяржавы, фарміраванне стабілізацыйных фондаў тавараў, вытворчасць якіх носіць сезонны характар, а таксама пытанні збалансаванасці спажывецкага рынку, забеспячэнне патрэб унутранага рынку айчыннай плодаагароднінай прадукцыяй у міжсезонны перыяд неаднаразова былі прадметам абмеркавання на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, заўважыла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ.** «Гэтай вясной беларусы нечакана сутыкнуліся з дэфіцытам добрай бульбы ў магазінах, — нагадала яна. — У развіццё гэтай тэмы 11 чэрвеня Прэзідэнтам быў падпісаны Указ № 232, які рэгулюе асаблівасці пастаўкі плодаагароднінай прадукцыі для рэспубліканскіх дзяржаўных патрэб. Дакумент накіраваны на забеспячэнне яшчэ большай стабільнасці на спажывецкім рынку і гарантаваную бесперабойную наяўнасць якасных пладоў і агародніны ў крамах у міжсезонны перыяд».

У мэтах выканання гэтага прадпісання Пастаяннай камісіяй быў падрыхтаваны ініцыятыўны законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці». «Мяркуецца ўвесці адміністрацыйнае спагнанне ў дачыненні да пастаўшчыка за непастаўку альбо недапастаўку плодаагароднінай прадукцыі па дагаворах пастаўкі такой прадукцыі з стабілізацыйных фондаў тавараў у гандлёвыя сеткі, а нарыхтоўшчыкаў — за адсутнасць у рэалізацыі такой прадукцыі. У Кодэкс аб адміністрацыйнай адказнасці будзе ўнесены новы артыкул 13.12-1. За гэтыя правапарушэнні мяркуецца адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу ад 5 да 12 базавых велічынь, а для юрыдычных асоб — ад 20 да 200 базавых велічынь. Мяркуем, што гэтыя меры змогуць упарадкаваць працу гандлёвых сетак, ліквідаваць наяўнасць тавarнага дэфіцыту і, самае галоўнае, забяспечыць жыхароў якаснай сацыяльна значнай плодаагароднінай прадукцыяй, асабліва ў міжсезонны перыяд», — падагульніла дэпутат.

### ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ РЫНКУ АДПАВЕДНЫХ ПАСЛУГ

У сучасных эканамічных і знешнепалітычных умовах роля аўдыту як інструмента забеспячэння фінансавай бяспекі суб'ектаў гаспадарання і дзяржавы ў цэлым пастаянна ўзрастае, запэўніла **член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Вольга ЖУК.** «Улічваючы гэту тэндэнцыю, карэкціроўка механізмаў ацэнкі добрасумленнасці аўдытараў і іх адпаведнасці патрабаванням прафесійнай этыкі, замацаванне мер па недапушчэнні здзяйснення дзеянняў, якія наносяць шкоду дзяржаве, з'яўляецца своечасовай і аб'ектыўна неабходнай мерай для вызначэння дзейсных механізмаў абароны правоў і законных інтарэсаў дзяржавы і арганізацый, якім аказваюцца паслугі ў сферы аўдыту», — падкрэсліла яна.

Законапраект «Аб змяненні Закона «Аб аўдытарскай дзейнасці» накіраваны на ўніфікацыю заканадаўства ў рамках ЕАЭС у сувязі з той работай, якая праводзіцца па фарміраванні адзінага рынку адпаведных паслуг. Такі крок дасць магчымасць павысіць якасць аказання медыцынскіх паслуг, забяспечыць абарону інтарэсаў дзяржавы і суб'ектаў гаспадарання. «Прымаючы ў першым чытанні законапраект, мы падкрэслівалі значэнне тэмы якасці паслуг у сферы аўдыту, важнасць дадзенага інстытута для дзяржавы і бізнес-супольнасці, грамадскую значнасць прафесіі аўдытара», — дадала Вольга Жук.

## Прадавец адмовіўся прыняць аплату праз тэрмінал? Патрабуйце касавы чэк!



На адрас рэдакцыі са сваёй набалелай праблемай звярнулася Вольга Мацкевіч, жыхарка г. Лепеля Віцебскай вобласці: «Разам з мужам мы часта наведваем краму, дзе прадаюцца тавары па нізкай цане, па вуліцы М. Горкага. Тут прапануюцца адзенне, абутак, цацкі, бытавыя рэчы і г. д. Такая ж крама была адкрыта і па вуліцы Партызанскай. Аднак кожны раз, прыходзячы сюды, чуем ад прадаўцоў адно і тое ж:

— Тэрміналы не працуюць! Аплата прымаецца толькі наяўнымі грашыма!

Атрымліваецца, што тэрміналы ў краме не працуюць пастаянна. Прыходзім сюды па пакупкі часта, амаль заўсёды чуем адно і тое ж. Аднак мы не лічым мэтазгодным здымаць з карткі ўсе наяўныя грошы. Большасць сродкаў захоўваем на картцы, бо аплату камунальных паслуг, крэдытаў робім праз Інтэрнэт. Наяўныя здымаем толькі ў невялікай колькасці. Чаму ж мы павінны здымаць з карткі грошы, каб разлічыцца ў вышэйназваных крамах? У іншых гандлёвых пунктах, у тым ліку прыватных, плацежныя тэрміналы працуюць пастаянна. Тут жа чамусьці ўвесь час узнікае праблема. Нядаўна, напрыклад, калі мы наведалі краму па вуліцы Партызанскай, у нас наогул узнік канфлікт з прадаўцом. Яна выказала незадаволенасць тым, што мы і іншыя пакупнікі для разліку ў іх гандлёвым пункце не маем наяўных грошай. Хіба ж гэта правільна? Вядома, што ўсе гандлёвыя прадпрыемствы — і дзяржаўныя, і прыватныя — павінны быць аснашчаны плацежнымі тэрміналамі. Пакупнікоў не павінна непакоіць тое, што яны не працуюць».

З падобнымі пытаннямі на адрас рэдакцыі звярталіся і іншыя жыхары Лепельскага раёна.

Для таго, каб дэталёва разабрацца ў праблеме, мы звярнуліся да **прэс-сакратара Міністэрства па падатках і зборах Сяргея САЛАДУХІ**, які адзначыў:

— Пра сітуацыі, калі прадаўцы крам адмаўляюцца прымаць аплату ў пакупнікоў праз тэрмінал, мы даведваемся неаднаразова. На вялікі жаль, яны ўзнікаюць не толькі ў г. Лепелі Віцебскай вобласці, а і на тэрыторыі іншых абласцей. Аднак кожная падобная сітуацыя патрабуе дэталёвага разгляду. Прычынай прыняцця толькі наяўных грашовых сродкаў можа быць як часовая няспраўнасць касавага абсталявання, так і наўмыснае парушэнне заканадаўства. Падатковымі органамі пастаянна праводзіцца комплекс разнастайных мерапрыемстваў, накіраваных на спыненне ўчынення правапарушэнняў, у тым ліку звязаных з прыёмам грашовых сродкаў. Наведаўшы тую ці іншую краму, пакупнік мае права разлічыцца за тавар наяўнымі грашыма або пры дапамозе пластыкавай карткі. Кожны факт аплаты, незалежна ад таго, як ён ажыццяўляўся — наяўнымі грашыма або карткай, — павінен быць пацверджаны касавым чэкам. Ён і будзе сведчыць пра тое, што касавая аперацыя адбылася. У выпадку, калі прадавец адмаўляецца выдаць касавы чэк, ён парушае патрабаванні заканадаўства, і пакупнік мае права паведаміць пра гэта на «гарачую лінію» падатковых органаў па адзіным нумары 189 або +37517-229-79-79. Па іх прымаюцца паведамленні аб парушэннях падатковага і іншага заканадаўства, кантроль за захаваннем



— Плануецца, што ў наступным годзе будуць скончаны будаўнічыя работы і камплектацыя абсталяваннем аперацыйна-рэанімацыйнага корпуса. Пасля таго як з'явіцца магчымасць выканання аперацыйных умяшанняў, да нас будуць пераведзены анкалагічныя аддзяленні хірургічнага профілю. І тады гарадская бальніца № 3 атрымае статус Гродзенскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера. А ўжо пасля гэтага пачнецца рэканструкцыя карпусоў 3-й бальніцы пад палатнае аддзяленне радыелагічнага і хіміятэрапеўтычнага аддзялення. Амбулаторна-паліклінічны корпус адыдзе пад анкадыспансернае амбулаторна-паліклінічнае аддзяленне на 300 наведванняў у адну змену. Будзе таксама завершана будаўніцтва 5-й чаргі, у рамках якой у эксплуатацыю ўводзяцца блок клінічных кафедр і пансіянат для пацыентаў, якім не трэба кругласутачнае назіранне. Дарэчы, аперацыйныя павінны працаваць у дзве змены. Гэта як вялікія, так і малыя аперацыйныя для розных тыпаў хірургічных умяшанняў, — расказаў галоўны ўрач.

Як падкрэсліў Уладзіслаў Фралоў, лячэнне анкахазворванняў — шматэтапнае, і кожны крок залежыць ад папярэдняга. Раней для аказання дапамогі пацыентаў адпраўлялі ў іншыя вобласці, потым яны вярталіся дамоў, каб далей праходзіць лячэнне. З уводам жа ў эксплуатацыю аб'екта дапамогу будуць аказваць цэнтралізавана. Толькі комплексны падыход дае магчымасць дасягнуць добрых вынікаў. У адной лакацыі чалавек зможа прайсці поўную дыягностыку, праапераваць, атрымаць хімія- і радыетэрапію.

## ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПШ

Вялікая частка работы анкалагічнага цэнтра будзе накіравана на прафілактыку і выяўленне захворванняў на ранніх стадыях. Новае абсталяванне, у тым ліку аднафатонны эмісійны камп'ютарны тамограф (аналагічны пазітроннаму), дазволіць выяўляць пухліны на ранніх стадыях, а комплексны падыход і цэнтралізаванае аказанне анкалагічнай дапамогі павысяць якасць дыягностыкі і лячэння.

— Важным аспектам з'яўляецца прафілактычная работа спецыялістаў пярвічнага звяна. Вельмі важна, каб медыкі на месцах не былі абыякавымі і праяўлялі насцярожанасць. Напрыклад, быў такі выпадак. Мужчына прыйшоў да стаматолага лячыць зуб. Урач заўважыў запаленне, якое яго насцярожыла, спытаў, як даўно з'явілася. Пацыент сказаў, што ўжо месяцы два не праходзіць. Стаматолаг тэрмінова направіў яго да анколага. І калі такім уважлівым будзе кожны ўрач, выжывальнасць пацыентаў таксама стане вышэйшай. Ды і самі людзі не павінны пускаць на самацёк свой стан. Не думаць: «пабаліць і перастане».

## ЗАХАВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

Рэарганізацыя ўстаноў аховы здароўя не пакіне нікога без працы. Персанал пераязджае разам з аддзяленнямі. Паколькі абсталяванне новае, складанае, медыкі праходзяць навучанне, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі, каб якасна аказваць дапамогу.

— Напрыклад, урачы прайшлі навучанне для правядзення брахітэрапіі. Гэта метад прамянёвай тэрапіі, пры якім радыеактыўная крыніца размяшчаецца побач з пухлінай ці нават усярэдзіне яе. У ходзе працэдуры да мішэні падводзіцца высокая доза радыяцыі, а навакольныя тканкі атрымліваюць толькі невялікую колькасць выпраменьвання... Акрамя таго, да нас размеркаваны маладыя спецыялісты. Вельмі талковая моладзь. Ім усё цікава, яны гатовыя спазнаваць, вучыцца. Да таго ж абсталяванне валодае і навукова-даследчым патэнцыялам.

Будаўніцтва дарагое, у яго ўкладзена больш за 300 мільёнаў рублёў, закуплена найноўшае аснашчэнне. Так, нагрузка на бюджэт сур'ёзная, але здароўе насельніцтва вышэй за ўсё. Ранняе выяўленне анкалагічных захворванняў дасць магчымасць праводзіць радыкальнае лячэнне і зменшыць інвалідызацыю пацыентаў. Анкадыспансер будзе забяспечваць доступ да спецыялізаваных дыягностыкі і лячэння, скарачаючы час паміж выяўленнем захворвання і пачаткам аказання медыцынскай дапамогі.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, фота аўтара.**

якога ўскладзены на падатковыя органы. Калі грамадзяніну, напрыклад, не далі чэк або адмовілі ў аплаце банкаўскай плацежнай карткай, ён мае права патэлефанаваць і паведаміць аператару пра месца, час і іншыя факты парушэння падатковага заканадаўства, а таксама свае кантактныя даныя для ўдакладнення інфармацыі спецыялістамі падатковай службы.

Другім спосабам паведамлення пра парушэнні з'яўляецца дзяржаўная адзіная (інтэграваная) рэспубліканская сістэма ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб: партал «Обращение. Бел». Аднак пры гэтым абавязкова трэба папярэдне зарэгістравацца на партале. Ананімныя звароты ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь не разглядаюцца.

Для таго каб выкараніць выпадкі парушэнняў пры абслугоўванні пакупнікоў, грамадзянам (у дадзенай сітуацыі — пакупнікам) не трэба садзейнічаць іх учыненню. Своечасовае паведамленне пра факт неналежнага абслугоўвання пакупнікоў з пацвярджэннем — касавым чэкам — дазволіць своечасова выявіць і спыніць падобныя з'явы. Самае галоўнае — паведаміць праўдзівую і абгрунтаваную інфармацыю, якую пацвярджаюць адпаведныя дакументы.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**

* * *

**Паважаныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні ў вырашэнні пэўнай праблемы, ёсць патрэба атрымаць кампетэнтны каментарый таго ці іншага спецыяліста, заўсёды будзем рады вам дапамагчы. Пра ўзніклыя праблемы вы можаце паведаміць, звярнуўшыся па нумары 8 (033) 309-84-01. Будзем заўсёды рады нашаму плённаму супрацоўніцтву!**

# КАСІ, КАСА, ПАКУЛЬ РАСА...

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар.)***

У першую чаргу ўстрывожыліся дачнікі, бо ў таго, хто жыве ў прыватным сектары пастаянна, барацьба з травой — праблема, якая залежыць у асноўным ад узроўню самадысцыпліны. А што рабіць таму, хто прыязджае на ўчастак час ад часу? А калі рэгулярна касіць не дазваляе пажылы ўзрост або інваліднасць? Як не прапусціць праверку, бо за невыкананне правілаў добраўпарадкавання прадугледжаны штраф?

За каментарыем мы звярнуліся да **намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэя РАМАШКІ.** Ён патлумачыў, што пастанова Саўміна распрацавана, каб аб'яднаць у Год добраўпарадкавання намаганні дзяржавы, розных арганізацый і грамадзян для навядзення парадку на зямлі, паляпшэння экалогіі і фарміравання эстэтыкі населеных пунктаў Беларусі. «Былі канкрэтызаваны патрабаванні да ўтрымання прыдамавых тэрыторый як для грамадзян, так і ў цэлым тэрыторый населеных пунктаў, у тым ліку замацаваных за прадпрыемствамі», — расказаў намеснік міністра. Напрыклад, пастановай рэгламентаваны межы пасадкі дрэў, кустоў, а таксама размяшчэнне газонаў у дачненні да сумежных зямельных участкаў, дапоўнены функцыі спецарганізацый па азеляненні і інш.



Што датычыцца патрабавання да травы, то яно, паводле слоў Андрэя Рамашкі, дзейнічае з 2020 года: «Але гэта не гаворыць аб тым, што хтосьці будзе хадзіць і вымяраць вышыню травы, і калі яна будзе 21 сантыметр, то даваць штраф. Гэтыя нормы неабходныя, каб разумець, калі час выконваць работы па ўтрыманні газонаў і навядзенні парадку на азеляняльных тэрыторыях».

За парушэнне правілаў добраўпарадкавання сапраўды прадугледжана адміністрацыйная адказнасць, аднак Андрэй Рамашка акцэнтаваў увагу на тым, што «мэта — не лавіць і караць людзей, а пагаварыць, давесці да ведама патрабаванні і пракантраляваць іх выкананне».

Не варта трывожыцца і пажылым, паколькі мясцовым уладам даручана дапамагаць адзінокім пенсіянерам і інвалідам наводзіць парадак на прыдамавых тэрыторыях. Не пакінуць іх сам-насам з праблемай і прадстаўнікі маладзёжных і грамадскіх аб'яднанняў.

**Ірына ПЯТРОВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### *ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей** | | | | | |
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв.500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – помещение многофункциональное. Назначение – помещение многофункциональное. Объект недвижимости обременен арендой, ипотекой. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **6 024 401,25** | **Задаток, BYN** | **301 220,06** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/С-24792, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 41. Площадь – 5415,7 кв. м. Наименование – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Объект недвижимости обременен арендой.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000007001069 площадью 3,5098 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона канализации, площадь 0,1551 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **8 264 901,96** | **Задаток, BYN** | **413 245,10** | **Шаг аукциона** | **5%** |
| **Сведения о продавце/организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел.: 8 017 284 94 32, 8 029 754 63 46, Мария,<br>e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются п**о 11 июля 2025 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **14 июля 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона | | | | | |

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Белорусскому республиканскому унитарному предприятию экспортно-импортного страхования «Белэксимгарант» филиал «Белэксимгарант-Минская область»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 25.07.2025**

**Лот № 1:** павильон модульного типа с инв. № 10006/ОС6 с конструкцией из каркаса с крышей площадью 6 кв. м. Начальная цена с НДС 20 % – 1 512,00 руб.
Местонахождение: Минская обл., Слуцкий р-н., г. Слуцк, пр. М. Богдановича, 6а.
Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by) и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by** УНП 190055182

# УВАГА! ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## «АКАДЕМИЯ ОБРАЗОВАНИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ

за счет средств республиканского бюджета

на 2025 год

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (2 места на обучение в дневной форме, 1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.03 «Коррекционная педагогика (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия)» (1 место на обучение в дневной форме);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии» (1 место на обучение в дневной форме);
19.00.05 «Социальная психология» (1 место на обучение в форме соискательства);
22.00.06 «Социология культуры» (1 место на обучение в заочной форме)

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (3 места на обучение в дневной форме; 1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в дневной форме);
13.00.08 «Теория и методика профессионального образования» (1 место на обучение в дневной форме)

**Осуществляется также обучение в аспирантуре и докторантуре за счет собственных средств**

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:

0909.00.11 «Социальная философия»;
13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
13.00.08 «Теория и методика профессионального образования;
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология»;
22.00.06 «Социология культуры»

### СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
13.00.08 «Теория и методика профессионального образования»;
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология».

**Прием документов с 1 августа по 30 сентября.**

**Вступительные испытания будут проходить с 1 по 17 октября. Начало занятий – 1 ноября.**

Подробности на сайте: **https://www.akademy.by.**

Обращаться по адресу: **220004, г. Минск, ул. Короля, 16, каб. 323, 324.**

Контактные телефоны: **+375 (17) 229 19 59, 229 19 01.**

УНП 190374888

Государственное учреждение образования «Институт бизнеса Белорусского государственного университета»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ на 2025 год на платной основе

по специальности 08.00.05 «Экономика и управление народным хозяйством (логистика; экономика предпринимательства; экономическая безопасность)».

Прием документов осуществляется **с 1 августа по 30 сентября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Обойная, 7, каб. 412 (научно-исследовательский отдел), **тел. +375 (17) 282 29 76.**

Вступительные испытания на дневную и заочную форму обучения будут проходить **с 1 по 17 октября 2025 года.**

Начало занятий – **1 ноября 2025 года.**

С подробной информацией по условиям поступления можно ознакомиться на сайте Института: **http://www.sb.bsu.by** в разделе «**НАУКА**».

УНП 101117830

## В СООТВЕТСТВИИ КОНТРОЛЬНЫМИ ЦИФРАМИ ПРИЕМА

**для получения научно-ориентированного образования за счет средств республиканского бюджета**

учреждение образования «БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ АВИАЦИИ»

**объявляет прием в аспирантуру по специальности 05.22.14 – эксплуатация воздушного транспорта в 2025 году**

| Организация-исполнитель | Организация-заказчик | Шифр специальности | АСПИРАНТУРА | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Всего | Из них по форме обучения | | |
| | | | | Дневная | Заочная | Соискательство |
| УО «Белорусская государственная академия авиации» | Организация-исполнитель | 05.22.14 | 1 | 0 | 0 | 1 |
| УО «Белорусская государственная академия авиации», **ИТОГО** | | | **1** | **0** | **0** | **1** |

**ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ с 1 августа по 30 сентября 2025 года**

по адресу: г. Минск, ул. Уборевича, 77, тел.: 378 32 81, 249-97-65 УО «Белорусская государственная академия авиации».

**Начало занятий – 1 ноября 2025 года.**

УНН 100005688

## Учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет»

## объявляет прием в аспирантуру и докторантуру на 2025 год

**по следующим отраслям науки и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе**

### АСПИРАНТУРА*

| Специальность | Форма получения образования | | |
|---|---|---|---|
| | дневная | заочная | соискательство |
| **ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ** | | | |
| **08.00.01** – экономическая теория | 2 | – | – |
| **08.00.05** – экономика и управление народным хозяйством | 5 | 1 | 1 |
| **08.00.10** – финансы, денежное обращение и кредит | 3 | – | 1 |
| **08.00.12** – бухгалтерский учет, статистика | 2 | 2 | – |
| **08.00.13** – математические и инструментальные методы экономики | 1 | – | – |
| **08.00.14** – мировая экономика | 2 | – | – |
| **ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ** | | | |
| **12.00.03** – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право | 2 | 1 | – |
| **12.00.05** – трудовое право; право социального обеспечения | 3 | – | – |
| **12.00.14** – административное право, административно-деликтное право, административный процесс | 2 | – | – |
| **ПОЛИТИЧЕСКИЕ НАУКИ** | | | |
| **23.00.01** – теория и философия политики, история и методология политической науки | 1 | – | 1 |
| **23.00.02** – политические институты, процессы и технологии | 2 | – | – |
| **23.00.04** – политические проблемы международных отношений, глобального и регионального развития | 2 | – | 1 |

**Указано количество мест для получения научно-ориентированного образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы аспирантуры осуществляется: **в дневной форме** получения образования — 3 года, **в заочной форме** получения образования — 4 года, **в форме соискательства** — до 5 лет.

Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

### ДОКТОРАНТУРА*

| Специальность | Форма получения образования | |
|---|---|---|
| | дневная | соискательство |
| **08.00.00 – экономические науки** | | |
| **08.00.01** – экономическая теория | 1 | – |
| **08.00.05** – экономика и управление народным хозяйством | 3 | – |
| **08.00.10** – финансы, денежное обращение и кредит | 2 | – |
| **08.00.12 –** бухгалтерский учет, статистика | – | 2 |
| **08.00.14** – мировая экономика | 1 | — |

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы докторантуры осуществляется: **в дневной форме** получения образования — 3 года, **в форме соискательства** — до 5 лет.

Прием лиц для получения научно-ориентированного образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12.2011 № 561).

Лица, поступающие в аспирантуру и докторантуру БГЭУ, предварительно проходят собеседование на профильных кафедрах.

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

**ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ с 1 АВГУСТА по 30 СЕНТЯБРЯ (кроме субботы, воскресенья).**

Время работы приемной комиссии с **9.00** до **12.30** и с **14.00** до **16.30**.

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГЭУ обращаться:

220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 26, учебный корпус 6, комн. 17.
тел. (+375 17) 209-78-85. E-mail aspirantura@bseu.by
Проезд: троллейбусами 3, 15, 16, 17, 34, 41;
автобусами 59, 79, 93 до остановки «Площадь Ванеева», 84 до остановки «Экономический университет».

**НАЧАЛО ОБУЧЕНИЯ — 1 ноября**

УНП 100015608

Учреждение образования «Белорусский государственный университет физической культуры»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ на 2025 год

**по следующим отраслям наук и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе**

### АСПИРАНТУРА*

| Специальность | Форма получения образования | | |
|---|---|---|---|
| | дневная | заочная | соискательство |
| **03.03.00 – биологические науки** | | | |
| 03.03.01 – физиология | 1 | – | – |
| 03.03.02 – Антропология | 1 | – | – |
| **13.00.00 – педагогические науки** | | | |
| 13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры | 3 | 2 | 3 |

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы аспирантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — не более 3 лет, в заочной форме получения образования — не более 4 лет, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

### ДОКТОРАНТУРА*

| Специальность | Форма получения образования | |
|---|---|---|
| | дневная | соискательство |
| **13.00.00 – педагогические науки** | | |
| 13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры | 2 | – |

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы докторантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — не более 3 лет, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения научно-ориентированного образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12. 2011 № 561).

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГУФК — **1 ноября 2025 года.**

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГУФК обращаться:

**220020, г. Минск, пр-т Победителей, 105, кабинет 550.**
Тел. **+375 17 3775355.** E-mail: **aspirantura@sportedu.by.**
Прием документов в аспирантуру и докторантуру **с 1 августа по 30 сентября 2025 года.**

УНП 100007545

Учреждение образования «ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА 2025 ГОД

за счет средств республиканского бюджета

| Шифр | Специальность | Дневная | Заочная |
|---|---|---|---|
| **АСПИРАНТУРА** | | | |
| 01.04.02 | Теоретическая физика | 2 | – |
| 03.02.01 | Ботаника | 1 | – |
| 10.01.01 | Белорусская литература | 1 | – |
| 10.01.02 | Русская литература | – | 1 |
| 10.02.01 | Белорусский язык | 1 | 1 |
| 10.02.02 | Русский язык | 5 | – |
| 19.00.05 | Социальная психология | 1 | – |
| 13.00.01 | Общая педагогика, история педагогики и образования | 2 | – |
| 13.00.04 | Теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры | 3 | – |

*Подготовка аспирантов осуществляется и на платной основе.*

**Прием документов с 1 по 30 сентября 2025 г.**

**г. Гомель, ул. Советская, 104, корпус 4, кабинет 4-6**

**Зачисление в аспирантуру – 1 ноября 2025 г.**

Подробная информация **по тел. 8 (0232) 510096** или на сайте университета **www.gsu.by**

УНП 400011099

# «МАСТАЦТВА — ГЭТА ТАКСАМА ДЫСЦЫПЛІНА»

## Мастак у чацвёртым пакаленні служыць у інспекцыі па справах непаўналетніх

Нягледзячы на летнія канікулы, работы ва ўчастковых інспектараў па справах непаўналетніх менш не стала, калі не наадварот. Участковы інспектар па справах непаўналетніх Ленінскага РУУС г. Мінска лейтэнант міліцыі Кірыл КАНДРАТОВІЧ з той жа рэгулярнасцю, як і падчас навучальнага года, наведвае дзіцячыя калектывы. Найперш для таго каб папярэдзіць парушэнні і злачынствы сярод непаўналетніх. Летам узрастае рызыка трапіць у надзвычайную сітуацыю, а таму своечасова праведзеная гутарка, словы падтрымкі кампетэнтнага чалавека ў складанай сітуацыі вырашаюць многае.





### САПРАЎДНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Днямі мы далучыліся да супрацоўніка міліцыі, які наведваў сталічную сярэднюю школу № 224. На працягу летніх канікул тут функцыянуе выхаваўча-аздараўленчы лагер, у якім весела і карысна праводзяць час школьнікі розных узростаў. За Кірылам Кандратовічам замацаваны тры школы ў Ленінскім раёне сталіцы: акрамя 224-й, яшчэ сярэдняя школа № 24 і гімназія № 40. Ён рэгулярна праводзіць у гэтых сценах прафілактычныя гутаркі, наведвае сваіх падапечных, якія стаяць на індывідуальным прафілактычным уліку, і па месцы жыхарства. «Часта трэба размаўляць не столькі з дзецьмі, а з іх бацькамі, — лічыць супрацоўнік органаў унутраных спраў. — Шмат што ідзе з сям'і. Дзеці часта бачаць, як іх бацькі спажываюць алкаголь, затым імкнуцца гэтак жа сябе паводзіць».

На індывідуальны прафілактычны ўлік, як правіла, трапляюць непаўналетнія, якія былі заўважаны за распіццём алкагольных напояў, тыя, хто любіць памахаць кулакамі. Міліцыянер перакананы: кожнаму, хто аступіўся, трэба даваць шанц выправіцца. Па яго словах, важна, калі сам падлетак усведамляе свой негатыўны досвед, робіць высновы і не паўтарае памылак.

### ПРАДАЎЖАЛЬНІК ДЫНАСТЫІ

Найлепшым адпачынкам пасля напружанага працоўнага дня для супрацоўніка Ленінскага РУУС сталіцы з'яўляецца мастацтва. Як высветлілася, Кірыл Кандратовіч — прадаўжальнік дынастыі мастакоў. Жывапісам захапляўся яшчэ яго прадзед. Інспектар па справах непаўналетніх — мастак у чацвёртым пакаленні.

Кватэра, дзе малады чалавек жыве разам з жонкай, нагадвае карцінную галерэю. Усе пакоі аформлены яго работамі. Тут і «Раніца ў хвойным лесе» Шышкіна і Савіцкага, і «Юдзіфь і Алаферн» Караваджа, і «Дзявяты вал» Айвазоўскага, партрэты Рубенса... Рэплікі вядомых карцін — той стыль, якому аддае перавагу аўтар.

Кірыл грунтоўна паглыблены ў гісторыю мастацтва. Ён дэталёва расказвае пра асаблівасці класічнага жывапісу, мастацкія стылі, адрозненне фламандскай і італьянскай школ жывапісу, біяграфіі аўтараў... Пры гэтым малады чалавек не заканчваў спецыялізаваных творчых устаноў. Усё, што ведае, — выключна дзякуючы ўласнай дапытлівасці і імкненню да самаадукацыі.

Цяперашні праваахоўнік з самага дзяцінства любіў маляваць. Калі сябры хлопца выяўлялі маму-тату, прымітыўнага чалавечка, Кірыл адлюстроўваў на паперы сюжэты з аповесці Волкава «Чараўнік Ізумруднага горада». На канікулы хлопец з'язджаў да бабулі і дзядулі, які даваў майстар-класы па жывапісе свайму ўнуку. «Аднойчы павёз мяне ў Лахву Лунінецкага раёна, дзе жыў мой прадзед-мастак, — узгадвае міліцыянер. — Уся яго хата была застаўлена карцінамі. Ён працаваў на чыгунцы, творы пісаў у вольны ад работы час».

Кірыл расказвае, што ва ўсе часы людзі мелі патрэбу ў мастацтве. А таму жывапіс з'яўляўся свайго роду «падушкай бяспекі» для сям'і, дзе выхоўвалася пяцёра дзяцей. «Карціны абменьваліся на дровы, прадукты харчавання, аднойчы ў ходзе такога абмену ў хатняй гаспадарцы з'явілася карова, — расказвае праўнук творцы. — Такая ж аплата была і за паслугі ўрача, падвоз да горада і гэтак далей».

Безумоўна, матэрыялы, неабходныя для творчасці, па тым часе з'яўляліся прадметам раскошы. Таму Георгій Кандратовіч сам рыхтаваў грунт для палотнаў, варыў клей. «У нас засталіся прадзедавы фарбы, якія дагэтуль прыдатныя для выкарыстання, — заўважае малады чалавек. — Ім 80 гадоў, і я сам імі малюю».

З пяці дзяцей Георгія Кандратовіча творчыя здольнасці пераняў толькі адзін сын — ён стаў дзядулем Кірыла. Юрый Кандратовіч таксама нідзе не вучыўся пісаць карціны. Мастацтвам займаўся пасля працоўнай змены на чыгунцы. Бацька Кірыла ў меншай ступені займаўся жывапісам. Талент ён таксама пераняў, але, як кажа яго сын, не выкарыстоўвае ў поўнай меры.

### ЖАДАННЕ ДАПАМАГАЦЬ ДЗЕЦЯМ

Любая творчасць патрабуе натхнення. А як жа быць, калі служба займае значную частку часу?! «Я магу працаваць у другую змену, — кажа малады чалавек. — На шкоду сну, вядома. Гэта звычка ў мяне яшчэ са студэнцтва».

Кірыл Кандратовіч скончыў гістарычны факультэт БДУ. Цікаўлюся, чаму гістфак, а не, напрыклад, Акадэмію мастацтваў? «Гэта ж цікава», — кажа малады чалавек. Дарэчы, гістфак падарыў яму жонку, з якой малады чалавек распісаўся па заканчэнні БДУ.

Яшчэ на чацвёртым курсе ўніверсітэта будучы міліцыянер пачаў настаўнічаць у сярэдняй школе № 93 г. Мінска. Паглядзеўшы на дзяцей, на тое, як яны паводзяць сябе на ўроках, настаўнік гісторыі цвёрда вырашыў для сябе дапамагчы ім на іншым узроўні. У выніку Кірыл звярнуўся ў Ленінскае РУУС з пытаннем аб працаўладкаванні. Жаданне служыць у інспекцыі па справах непаўналетніх было падтрымана.

Пасля праходжання трохмесячнага навучання ў Цэнтры падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС Кірыл Кандратовіч выйшаў на службу. Тут сямейная дынастыя таксама атрымала працяг: яго дзед па матчынай лініі служыў афіцэрам савецкай арміі.

Здаецца, творчасць і дысцыпліна — рэчы несумяшчальныя. «Творчасць — гэта таксама свайго роду дысцыпліна, — перакананы супрацоўнік міліцыі. — Я не магу маляваць элемент у адзін прыём. Як бы моцна ні хацелася пакласці фарбу, трэба прытрымлівацца тэхналогіі. Ад малюнка да канчатковай выявы праходзіць вельмі шмат стадый работы. І ад дысцыпліны ў тым ліку залежыць канчатковы вынік».

**Вераніка КАНЮТА.**




**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**
**по продаже недвижимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00141** по продаже

**недвижимого имущества**

на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

**Организатор, оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 25.07.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-163202 площадью 217,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11Г-10, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – нежилое помещение подвала. Примечания: нежилое помещение подвала. Крыльца бетонные – 17 кв. м. Места общего пользования – тамбур – 6,5 кв. м, лестничные клетки – 19,2 кв. м, 17,8 кв. м, 23,0 кв. м, 17,3 кв. м, 19,7 кв. м, 17,1 кв. м, 19,7 кв. м, 16,9 кв. м, 19,4 кв. м, коридоры – 22,5 кв. м, 16,8 кв. м, машинное отделение – 116,8 кв. м, мастерская лифтеров – 15,3 кв. м. Объем мест общего пользования – 1179 куб. м.

Обременение: договор аренды сроком по 31.03.2026. Запрещение регистрационных действий.

Лифт грузовой ПГ-288 инв № Э 2988 грузоподъемностью 1000 кг.

**Нач. цена: 75 982,73 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 7598,27 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 24.07.2025. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 676,51 бел. руб. с НДС.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел: +375445928209, Светлана Георгиевна.



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)*, по поручению **ОАО «Сковшин»** *(Продавец)*, проводит открытый аукцион по продаже

**здания коровника**

**с инв. № 644/С-62946 общ. пл. 1 631,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625081300001000118 (право постоянного пользования) площадью 0,5806 га по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Домановичский с/с, 12, р-н д. Завыход.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **87 960,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **8 796,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **29.07.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.07.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17. Тел. для осмотра: (8017) 420-34-45, 8 (029) 684-18-78.**

УНП 600072165



В суд Добрушского района Гомельской области поступило заявление Лысенкова Александра Николаевича о признании безвестно отсутствующим Лысенкова Николая Николаевича, 05 апреля 1959 года рождения, последнее известное место жительства: Гомельская область, Добрушский район, п. Дударево, ул. Рабочая, д. 16.

Всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Лысенкове Николае Николаевиче, просьба сообщить их суду Добрушского района Гомельской области в течение двух месяцев с момента публикации по адресу: 247054, Гомельская область, г. Добруш, ул. Пушкина, 13, или по телефону: 8 02333 2 47 71, или по e-mail: dobrush@court.by

# УТАЙМАВАННЕ «ХУЛІГАНА»?

## ЗША здзейснілі авіяналёт на тры ядзерныя аб'екты Ірана

У ноч на 22 чэрвеня ЗША нанеслі ўдары па Іране. Былі цалкам знішчаны ключавыя ядзерныя аб'екты, заявіў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Чым на гэта адкажа Іран і ці будзе ён адзінокі ў дадзенай няроўнай сутычцы?

### БОМБЫ ПА ЯДЗЕРНЫХ АБ'ЕКТАХ ЯК СПОСАБ ПРЫМУСУ ДА МІРУ?

Гучыць, вядома, сюррэалістычна, але так і ёсць насамрэч. Амерыканская авіяцыя нанесла ўдары па ядзерных аб'ектах у Ісфахане, Натанзе і Фордა. Пры гэтым на абагачальнае прадпрыемства ў Фордა былі скінуты ажно 12 (!) звышцяжкіх пранікальных бомбаў GBU-57A, кожная з якіх важыць па 13 тон. Лічыцца, гэта адзіная зброя на планеце, здольная трапіць у бункеры, схаваныя глыбока пад зямлёй. Для іх дастаўкі да пункта скіду выкарыстоўваліся амерыканскія бамбардзіроўшчыкі У-2 Spirit, адзіны тып самалёта, здольны несці такое ўзбраенне. Яны вылецелі з базы ў Місісіпі і правялі ў паветры з дазапраўкай 37 гадзін. Акрамя таго, амерыканцы выпусцілі з падводных лодак да 30 крылатых ракет «Тамагаўк». Аднак Тэгеран настойвае, што з Фордა абсталяванне было даўно вывезена, а іншыя аб'екты ў выніку атакі і зусім не пацярпелі.

Выступаючы ў Белым доме з тэлезваротам да грамадзян у сувязі з нанясеннем удараў па Ісламскай Рэспубліцы, прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што амерыканскія ўзброеныя сілы цалкам знішчылі іранскія аб'екты па абагачэнні ўрану.

— Сёння вечарам я магу паведаміць усяму свету, што гэтыя ўдары завяршыліся ваенным поспехам. Ключавыя аб'екты Ірана па абагачэнні ўрану былі цалкам знішчаны, — заявіў амерыканскі лідар.

Ён таксама не ўтрымаўся ад ацэнак і пагроз, калі нешта пойдзе не па яго сцэнарыі:

— Іран — «хуліган» Блізкага Усходу. Гэта краіна павінна цяпер заключыць мір. Калі яны гэтага не зробяць, нашы наступныя атакі будуць значна больш маштабнымі.

Белы Дом заявіў, што сваю місію амерыканцы выканалі і далейшага ўдзелу ў канфлікце паспрабуюць пазбегнуць, калі іх не справакуюць на новыя атакі. Аднак удар па Іране выклікаў сапраўды буру планетарнага маштабу.

### НЕБЯСПЕЧНАЯ ЭСКАЛАЦЫЯ

Са свайго боку Іран запатрабаваў правесці пасяджэнне Савета Бяспекі ААН, на якім пастаянны прадстаўнік Ірана пры ААН Эмір Саід Іравані заклікаў Савет Бяспекі сусветнай арганізацыі прыняць меры супраць ЗША і Ізраіля як агрэсараў.



У ходзе пасяджэння Савета Бяспекі Амір Саід Іравані падкрэсліў, што ўсе абвінавачванні Вашынгтона ў адрас Тэгерана неабгрунтаваныя, не маюць юрыдычнай асновы і палітычна матываваныя, і запатрабаваў кантролю МАГАТЭ за ядзернымі аб'ектамі Ізраіля.

Пастаянны прадстаўнік Расіі, у сваю чаргу, заявіў, што Іран у адпаведнасці з Дагаворам аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі мае права на развіццё мірнай атамнай праграмы. Васіль Небензя падкрэсліў: калі эскалацыю ізраільска-іранскага канфлікту не спыніць, увесь свет можа апынуцца на мяжы ядзернай катастрофы.

Расія, КНР і Пакістан распаўсюдзілі сярод членаў СБ ААН праект рэзалюцыі з асуджэннем атакі ЗША на Іран.

Дарэчы, Антоніу Гутэрыш назваў тое, што адбылося, небяспечнай эскалацыяй. Дзеянні ЗША ўжо асудзілі цэлы шэраг краін, у тым ліку Чылі, Калумбія, Мексіка і г. д.

Дэмакраты ў Кангрэсе ЗША заявілі, што Трамп парушыў Канстытуцыю, і на гэтай падставе збіраюцца пачаць працэдуру імпічменту. Пачалася масавая эвакуацыя амерыканцаў з Блізкага Усходу, каб пазбегнуць нападаў на іх. Пакуль, зрэшты, Іран не нанёс удар у адказ па амерыканскіх аб'ектах, але зроблена некалькі ракетных залпаў па Ізраілі. Вядома, што зафіксаваны трапленні ў Хайфе, Тэль-Авіве і іншых гарадах. Ёсць і пацярпелыя.

Ракеты паляцелі ў адказ, але пакуль на Ізраіль. А ў заяве штаба Узброеных сіл Ірана адзначана, што ЗША зараз непасрэдна ўцягнутыя ў вайну з Іранам, але іх атака на ядзерныя аб'екты Ірана аказалася цалкам безвыніковай. Іран прыгразіў ЗША рашучым адказам на агрэсію ў дачыненні да Ісламскай Рэспублікі. Адказ будзе «магутным, мэтанакіраваным, непрадказальным і прымусіць агрэсара пашкадаваць аб зробленым». Удары ЗША развязалі рукі Ірану, сказана ў заяве: ён лічыць, што мае права прыняць меры ў адказ супраць амерыканскіх ваенных аб'ектаў.

Але самым адчувальным адказам Ірана для сусветнай эканомікі можа стаць перакрыццё Армузскага праліва, праз які танкеры з Персідскага заліва трапляюць у акіян. Прынамсі такое рашэнне прыняў парламент Ірана. Апошняе слова, праўда, за Саветам бяспекі і духоўным лідарам краіны, а іх рашэння на момант падпісання нумара не было. Тым не менш, пасыпаліся гучныя заявы. У прыватнасці, віцэ-прэзідэнт ЗША Джэй Дзі Вэнс заявіў, што гэты крок стане самазабойным для эканомікі Ірана. Але, падобна, не толькі Ірана, бо дзяржсакратар ЗША Марка Рубіа паведаміў, што амерыканцы звярнуліся да кітайскага боку з заклікам пераканаць Іран не перакрываць праліў. А кіраўнік еўрапейскай дыпламатыі Кая Калас назвала магчымае перакрыццё «вялізнай пагрозай», але дапусціла новыя санкцыі ЕС супраць Ірана, калі ён не спыніць сваю ядзерную праграму. Хоць. калі цэны на нафту значна ўзрастуць, ЕС можа стаць не да санкцый.

### А ЦІ БЫЎ ХЛОПЧЫК?

Цікава тое, што авіяўдары па ядзерных аб'ектах зроблены былі, а ўцечкі радыяцыі пасля іх зафіксавана не было. Супадзенне або выпадковасць?

У прыватнасці, арганізацыя па атамнай энергіі Ірана і Нацыянальны цэнтр ядзернай бяспекі Ірана не зафіксавалі ўцечкі радыеактыўных рэчываў і прыкмет радыеактыўнага забруджвання пасля ўдараў ЗША па ядзерных аб'ектах у Ісфахане, Натанзе і Фордა, заявілі ў ведамстве.

«Мы неадкладна правялі неабходныя праверкі на прадмет магчымай уцечкі радыеактыўных рэчываў у раёне атакаваных аб'ектаў. Пагрозы для насельніцтва няма», — паведаміў рэгулятар, заяву якога прыводзіць іранскае дзяржаўнае агенцтва IRNA.

«З улікам прынятых мер, папярэдняга планавання і звестак, зафіксаваных сістэмамі вызначэння радыеактыўных рэчываў, прыкмет забруджвання не выяўлена», — дадалі ў агенцтве.

Цэнтр таксама афіцыйна абвінаваціў ЗША ў нанясенні ўдараў па аб'ектах, якія адносяцца да ядзернай праграмы Ісламскай Рэспублікі. Як адзначылі ў ведамстве, амерыканскія ўлады, здзейсніўшы напад на іранскія аб'екты, парушылі нормы міжнароднага права, уключаючы Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

Таксама стала вядома, што запланавана пасяджэнне Савета кіраўнікоў Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ), прысвечанае сітуацыі ў Іране пасля амерыканскіх удараў па іранскіх ядзерных аб'ектах. Такую заяву зрабіў генеральны дырэктар МАГАТЭ Рафаэля Гросі ў сацсетцы X.

«У сувязі з надзвычайнай сітуацыяй у Іране я склікаю экстраннае пасяджэнне Савета кіраўнікоў МАГАТЭ», — напісаў ён.

**Па матэрыялах ТАСС і «Першага інфармацыйнага».**

*Мы працягваем сачыць за сітуацыяй у раёне Персідскага заліва.*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**
**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**
**Продавец: ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», г. Калинковичи, ул. Чехова, 17**
**Торги состоятся 14 июля 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке по определению рыночной стоимости по лоту № 1 – 120,00 бел. руб.; по лотам №№ 2, 3, 4 – 107,80 бел. руб. за каждый лот; по лоту № 5 – 220,00 бел. руб. | | | |
| Местонахождение: г. Калинковичи, ул. Чехова, 17 | | | |
| 1 | Рубительная машина УВЫИН (EDSBHUGGEN) 250 Н, инв. № 1001149 | **5 970,00** | 597,00 |
| **Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (033) 616-72-16, Чернявский Эдуард Петрович. Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 июня 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 июля 2024 г. в 16.00 включительно**. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 11.01.2025 г. | | | |
| **ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА** **Торги состоятся 25 июля 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28** | | | |
| 2 | **Автомобиль грузовой фургон изотермический GAZ C41RB3-1060-26-401-67-00-000 BELAVA,** рег. № АН 0711-3, г. в. 2020, № кузова Z0D1120K0L0006417, X96C41R33L1122444, цвет – белый, объем двигателя 4,4 л, пробег – 152014 км (инв. № 10011866). Состояние – на ходу | **48 000,00** | 4 800,00 |
| 3 | **Автомобиль грузовой цистерна GAZ-3309,** рег. № AI 0132-3, г. в. 2011, № кузова 330700B0182451, Y39AC4900B0010005, цвет – белый, объем двигателя 4,7 л, пробег – 47491 км (инв. № 1001245). Состояние – на ходу | **40 800,00** | 4 080,00 |
| 4 | **Автопогрузчик вилочный EP FD30T-TD27,** г. в. 2010, № кузова 3010667, двигатель 2,6 л, цвет – оранжево-черный, пробег – 13067 м/ч (инв. № 1001229). Состояние – на ходу | **21 600,00** | 2 160,00 |
| 5 | **Грузовой вагон GAZ A31R32,** рег. № АМ 3385-3, г. в. 2018, № кузова A31R33J001682X96A31R32J0851632, цвет – темно-серый, двигатель 2,8 л, (инв. № 10011825). Состояние – не на ходу | **27 600,00** | 2 760,00 |

**Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Калинковичский завод бытовой химии»)**: р/с BY70 BLBB 3012 0400 0230 8000 1001, БИК BLBBBY2X, в ЦБУ № 307 ОАО «Белинвестбанк» г. Калинковичи, УНП 400023080, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лотам №№ 1, 2, 3, 4, 5. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса». 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 июня 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 23 июля 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение 30 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.** Проводится аукцион в соответствии с Положением ЗАО «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»). Организатор аукционных торгов: • 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

# ПОЛЬСКАЯ ТРАСКАТНЯ

## У Наўроцкага могуць «адціснуць» перамогу на карысць Тшаскоўскага?



**У краіне-суседцы разгараецца чарговы скандал, звязаны з прэзідэнцкімі выбарамі, якія прайшлі 1 чэрвеня. Гэтым разам бок, які прайграў (кіруючая Грамадзянская кааліцыя), спрабуе даказаць памылкі пры падліку галасоў, што і дазволіла атрымаць перамогу Каралю Наўроцкаму. Улічваючы вопыт іншых членаў ЕС у аналагічнай сітуацыі, такі варыянт зыходу падзей таксама нельга выключаць.**

Усё змяшалася ў польскім каралеўстве! І гэтым разам тое, што цяпер адбываецца, больш нагадвае забаўляльную гульню на вяселлі: пакуль гучыць музыка, усе бегаюць вакол крэслаў, а як толькі яна сціхае, усе гульцы з неймавернай хуткасцю спрабуюць заняць найбліжэйшае да іх крэселка, каб не аказацца ўбаку. Сэнс такі: хто паспеў прысесці першым — той і мае права гуляць далей.

Аналагічная сітуацыя адбывалася і на выбарах прэзідэнта Польшчы. Пасля першага тура засталіся два кандыдаты — мэр Варшавы і стаўленік Грамадзянскай кааліцыі Рафал Тшаскоўскі і прыхільнік партыі «Права і справядлівасць» Караль Наўроцкі. Ні ў аднаго з іх не фіксавалася абсалютнай большасці галасоў, таму да апошняга было складана выказаць здагадку, у чый бок хіснуцца шалі. У выніку пасля галасавання 1 чэрвеня перамога з мінімальнай перавагай дасталася Каралю Наўроцкаму.

Нагадаем, што другі тур выбараў прэзідэнта ў Польшчы адбыўся 1чэрвеня. У прыватнасці, ён набраў 50,89 % галасоў выбаршчыкаў. Яго сапернік Рафал Тшаскоўскі атрымаў амаль на 370 тысяч галасоў менш. Розніца паміж кандыдатамі пры падліку галасоў склала менш за 2 %. Не істотна, як той казаў...

Дарэчы, назіральная місія АБСЕ на той момант не зафіксавала значных парушэнняў на выбарах, адзначыўшы высокі прафесіяналізм работнікаў выбарчых камісій.

Усё б добра, здавалася, сеў першым — крэсла тваё. Аказваецца, не ўсё так лёгка. У польскі выбаркам, як з рога багацця, пачалі сыпацца скаргі на памылкі ў падліку галасоў. Да разбору палётаў была вымушана падключыцца генеральная пракуратура, выбарачна праверыўшы 10 абласных выбарчых камісій. Вынік уразіў: у 9 з 10 выяўлены парушэнні.

«Замена галасоў у выбарчых камісіях. Маштаб раскрыты» — пад такім кідкім загалоўкам выйшаў на выхадных матэрыял на польскім рэсурсе RMF24.

У ім сцвярджаецца, што ў 9 камісіях былі выяўлены парушэнні, у тым ліку ў 7 з іх адбыўся абмен галасамі. Гэта прывяло да памылковага прызнання таго, што большую колькасць галасоў у тых акругах атрымаў Караль Наўроцкі, паведаміла агенцтву прэс-сакратар Генеральнага пракурора.

Яна адзначыла, што аналіз аглядаў пратаколаў паказаў: у сямі з дзесяці камісій адбылася замена галасоў, «што прывяло да памылкі, што большую колькасць галасоў у гэтых акругах атрымаў Караль Наўроцкі, у той час як пералік судом выбарчых бюлетэняў паказаў: гэту колькасць галасоў атрымаў Рафал Тшаскоўскі».

У матэрыяле ўдакладняецца: гаворка ідзе пра абласныя выбарчыя камісіі ў Кракаве, Стшэльцэ-Апольске, Мінску-Мазавецкім, Алесне, Грудзёндзе, Вянцы-Бжэсць-Куяўскім і нават у Гданьску (родным для Наўроцкага горадзе).

Што да іншых камісій, то ў Тарнове візуальны агляд пацвердзіў вынік галасавання, запісаны ў пратаколе, а ў абласной выбарчай камісіі ў Катавіцэ адбылося памылковае дадаванне абодвум кандыдатам несапраўдных галасоў.

А вось у Каменнай гары высветлілася, што ў пакеце, які змяшчае галасы, пададзеныя за кандыдата Караля Наўроцкага, былі бюлетэні за яго саперніка — Рафала Тшаскоўскага. З пераліку галасоў вынікае, што ў Каменнай гары большую колькасць галасоў атрымаў якраз Рафал Тшаскоўскі, а не Караль Наўроцкі, як паказана ў пратаколе камісіі.

Абвінавачанне паведамлена на платформе X, што ў агульнай колькасці парушэнні адбыліся ў 9 з 10 камісій. У сувязі са з'яўленнем новых парушэнняў у выбарчым працэсе генпракурор ужо заявіў, што будзе імкнуцца высвятліць усе сумневы, запатрабаваўшы, калі гэта неабходна, пералічыць выбарчыя бюлетэні, гаворыцца ў паведамленні яго прэс-сакратара.

У абгрунтаваных выпадках, як адзначаецца, будуць пачаты падрыхтоўчыя працэдуры для ўстанаўлення ўсіх абставін і іх прававой ацэнкі.

Сітуацыю ў сацыяльных сетках пракаментаваў сам міністр юстыцыі і генеральны пракурор Адам Боднар.

«Самая жудасная сітуацыя адбылася ў Каменнай гары, — напісаў ён на партале X.

У пакеце галасоў, пададзеных за Караля Наўроцкага, былі важныя галасы, пададзеныя за Рафала Тшаскоўскага. У пратаколе першапачаткова запісана перамога Караля Наўроцкага. Пасля пераносу галасоў у адпаведны спіс і падліку ўсяго яшчэ раз высветлілася, што больш галасоў атрымаў Рафал Тшаскоўскі. Пракуратура вывучае магчымасць здзяйснення злачынства», — паведаміў ён.

Як гаворыцца, запасаемся папкорнам і працягваем сачыць за сітуацыяй. Ужо вельмі цікавай яна можа аказацца на выхадзе.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

### У тэму

## У выбаркам Польшчы паступае рэкордная колькасць скаргаў на выніку выбараў прэзідэнта

Колькасць скаргаў на вынікі прэзідэнцкіх выбараў, якія прайшлі ў Польшчы, можа дасягнуць 50 тысяч, што практычна ў 10 разоў перавысіць паказчыкі папярэдніх выбараў кіраўніка дзяржавы ў 2020 годзе, паведамляе ТАСС са спасылкай на польскае агенцтва PAP і прэс-сакратара Вярхоўнага суда Рэспублікі (займаецца зацвярджэннем вынікаў выбараў) Аляксандра Стэмпкоўскага.

«Да чацвярга мы меркавалі, што колькасць пратэстаў складзе крыху больш за 40 тысяч, але ў пятніцу (20 чэрвеня. — «Зв.») па пошце прыйшло яшчэ 5 тысяч. І мы чакаем, што паступяць чарговыя. Такім чынам, разлічваем на 50 тысяч пратэстаў», — распавёў Стэмпкоўскі.

Акрамя таго, падчас гутаркі на радыёстанцыі Wnet ён назваў такі наплыў пратэстаў «гібрыднай атакай на Вярхоўны суд», аргументаваўшы гэта тым, што вельмі многія са скаргаў нібыта капіруюць тэкст, апублікаваны дэпутатам кіруючай Грамадзянскай кааліцыі Раманам Гертыхам. Згаданы народны выбраннік неаднаразова заклікаў пералічыць галасы на ўсіх выбарчых участках у сувязі з сістэматычнымі парушэннямі пры падліку галасоў.

Прадстаўнік Вярхоўнага суда паабяцаў, што орган пастараецца прытрымлівацца адведзенага законам тэрміну на рашэнне аб прызнанні вынікаў галасавання — на гэта адводзіцца 30 дзён з дня абвяшчэння вынікаў выбараў, г. зн. да 2 ліпеня. Аднак ён не выключыў, што Вярхоўны суд можа выйсці за рамкі гэтага тэрміну з-за беспрэцэдэнтнай колькасці скаргаў.


БЕЛАРУСБАНК

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ**

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Лот № 1** | |
| **Наименование объекта продажи** | Капитальное строение с инвентарным номером 443/С-20998 (гараж) общей площадью 22,0 кв. м, расположенное адресу: Гродненская область, Сморгонский район, г. Сморгонь, ул. Советская, 23 |
| **Начальная цена продажи** | 4920,00 (четыре тысячи девятьсот двадцать белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 820,00 (восемьсот двадцать белорусских рублей 00 копеек) |
| **Сумма задатка** | 490,00 (четыреста девяносто белорусских рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **25.07.2025 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 24.07.2025 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1592) 38861, +375 (44) 5455954 (А1), +375 (29) 1060792 (А1) |
| **Лот № 2** | |
| **Наименование объекта продажи** | Изолированное помещение с инвентарным номером 452/D-2611 общей площадью 141,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Зельвенский район, г. п. Зельва, ул. Победы, 1-2 |
| **Начальная цена продажи** | 80400,00 (восемьдесят тысяч четыреста белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС по ставке 20 % – 13400,00 (тринадцать тысяч четыреста белорусских рублей 00 копеек) |
| **Сумма задатка** | 8040,00 (восемь тысяч сорок белорусских рублей 00 копеек) |
| **Открытый аукцион состоится** | **25.07.2025 в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, актовый зал (помещение на третьем этаже)** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | В рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45, по 16.00 24.07.2025 включительно по адресу: г. Гродно, ул. Новооктябрьская, 5, кабинет 307 |
| **Дополнительные условия** | - подлежат возмещению расходы ОАО «АСБ Беларусбанк» по проведению рыночной оценки в размере 472,68 бел. руб. (четыреста семьдесят два белорусских рублей 68 копеек). Объект недвижимости имеет следующее обременение; - изолированное помещение с инвентарным номером 452/D-2611 в полном объеме передано в аренду |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с организацией осмотра объектов продажи и проведения аукциона, обращаться по телефонам: +375 (152) 737326, +375 (1564) 72610, +375 (44) 5455954 (А1), +375 (29) 3129906 (А1) |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка до 24.07.2025 на счет № BY69AKBB66708597000020000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Аукцион проводится при наличии не менее двух допущенных к участию в нем участников. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победителю аукциона задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета аукциона.

Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, аукцион признается несостоявшимся. В данном случае предмет аукциона продается участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

УНП 100325912

СПОРТ-ТАЙМ

# ЗАЧАРАВАННЕ ВЕСЛАВАННЯ

## «Кубак наймацнейшых спартсменаў» у Заслаўі прайшоў у трэндах гаспадароў

**Веславанне ў Беларусі было, ёсць і будзе. Від спорту, які падарыў краіне найбольшую колькасць алімпійскіх чэмпіёнаў, развіваецца і квітнее, нягледзячы ні на што. І міжнародны турнір па веславанні на байдарках і каноэ «Кубак наймацнейшых спартсменаў», які на мінулым тыдні прайшоў у Заслаўі, гэта даказаў.**



Усяго на вяслярным канале выступіла больш за 230 атлетаў з Беларусі, Расіі, Казахстана, Узбекістана і Кітая. Родная акваторыя дапамагла гаспадарам: беларусы заваявалі 45 узнагарод, з іх 19 залатых, 17 сярэбраных і 9 бронзавых. Пяціразовым пераможцам Кубка стаў Уладзіслаў Кравец. Ён выйграў тры адзіночныя дыстанцыі ў мужчынскай байдарцы (500 м, 1000 м і 5000 м), а таксама ўзяў па залатым медалі ў двойцы і чацвёрцы. У эліту айчыннага веславання Уладзіслаў увайшоў прыгожа — адразу на Алімпійскіх гульнях 2024 года. Тады ў Парыжы ён паказаў найлепшы вынік сярод беларускіх весляроў, спартсмену ўсяго крыху не хапіла, каб выйсці ў фінал. Яго чацвёртае месца — найлепшы індывідуальны вынік у гісторыі выступлення беларускай байдаркі на Алімпійскіх гульнях. Да Алімпіяды выхаванец пінскай школы веславання спецыялізаваўся на выступленнях у двойках і чацвёрках. Але Уладзіслаў Кравец можа паказваць высокі вынік і ў індывідуальнай праграме. Спартсмену ўсяго 25 гадоў, таму ён яшчэ зможа прадэманстраваць і больш высокія дасягненні ў будучыні. Аб гэтым казаў і старшы трэнер нацыянальнай зборнай Уладзімір Шантаровіч.

У жаночым веславанні на байдарцы вялікіх перамен няма. У гэтай частцы спаборніцтваў першынства не аддаюць Вольга Худзенка і Марына Літвінчук. Іх імёны ўжо сталі асацыіравацца з беларускім веславаннем на байдарцы. Марына перамагла на дыстанцыі 5000 метраў, Вольга — на 500 метрах. Свой чэмпіёнскі клас паказала і «залатая чацвёрка» ў складзе Вольгі Худзенка, Марыны Літвінчук, Надзеі Кушнер і Маргарыты Ткачовай — яны перамаглі на дыстанцыі 500 метраў.

Ёсць нагоды і для радасці за канаістаў. Напрыклад, на дыстанцыі 200 метраў перамагла Ева Данільчук, маладая і вельмі перспектыўная спартсменка. А другое і трэцяе месцы, якія занялі беларускі Кацярына Семянцова і Іна Нядзелькіна адпаведна, раздзялілі тры сотыя секунды — унутраная канкурэнцыя расце, што не можа не радаваць. Але ў той жа час фіналістка Алімпійскіх гульняў Юлія Трушкіна паказала толькі сёмы вынік, аднак яна рэабілітавалася ў «двойцы» на 200 метрах, дзе перамагла разам з Іннай Нядзелькінай.

У гэтым зачараванне веславання — у непрадказальнасці заездаў, у тым, што кожная дыстанцыя — гэта чысты ліст, невядомы сцэнарый, дзе галоўным героем становіцца наймацнейшы, а ў кожнай дыстанцыі свае наймацнейшыя.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

НАДВОР'Е

# ЧЭРВЕНЬ СПЯКОТАЙ НЕ ПЕСЦІЦЬ

## Чакаюцца залевы і моцны парывісты вецер

**Ноччу ў сярэдзіне апошняга чэрвеньскага тыдня будзе даволі холадна, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння ўмовы надвор'я будуць вызначаць актыўныя атмасферныя франты і няўстойлівая паветраная маса. Чакаецца ноччу воблачна з праясненнямі, у многіх раёнах кароткачасовыя дажджы, навальніцы, пры навальніцах месцамі моцныя ліўні. Днём пераменная воблачнасць, на большай частцы тэрыторыі будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Вецер уначы пераменных напрамкаў, удзень заходні парывісты, уначы месцамі, раніцай і ўдзень у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 10 да 16 °С, максімальная днём ад 17 да 23 °С. Атмасферны ціск начной парой будзе падаць, днём слаба расці.

У сераду ўначы надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, удзень адаб'ецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы. Чакаецца воблачна, ноччу з праясненнямі. Уначы месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы. Днём часам дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер заходняй чвэрці парывісты, ноччу месцамі, раніцай і днём у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 9 да 15 °С, а максімальная днём ад 15 да 21 °С, у паўднёвых і паўднёва-ўсходніх раёнах да 23 °С.

У чацвер уначы стане яшчэ халадней. У гэтыя суткі, ноччу захаваецца ўплыў франтальнага раздзела, які ссоўваецца ва ўсходнім напрамку. Днём надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі па паўночным усходзе краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы. Чакаецца ноччу воблачна з праясненнямі, днём пераменная воблачнасць. Ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па паўночным усходзе кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Вецер заходні, паўночна-заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 8 да 14 °С, а максімальная днём складзе ад 17 да 24 °С, па захадзе краіны да 26 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК, 751 мм рт.сл. | +12..+14°С | +15..+17°С |
| ВІЦЕБСК, 748 мм рт.сл. | +12..+13°С | +15..+19°С |
| МАГІЛЁЎ, 750 мм рт.сл. | +11..+13°С | +15..+16°С |
| ГОМЕЛЬ, 754 мм рт.сл. | +13..+15°С | +16..+18°С |
| ГРОДНА, 752 мм рт.сл. | +14..+15°С | +16..+19°С |
| БРЭСТ, 754 мм рт.сл. | +14..+16°С | +18..+21°С |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +18..+20°С

С.-ПЕЦЯРБУРГ +15..+17°С

### Месяц

*Апошняя чвэрць 18.06—24.06. Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## 24 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1855** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Кулябка-Карэцкі. У 1910-я гады жыў у Гомелі. Адзін з аўтараў мінскага літаратурнага альманаха «Туманы». Быў членам Гомельскага музычна-драматычнага таварыства, супрацоўнікам газеты «Гомельский вестник». Выдаваў і рэдагаваў газету «Гомельские отклики», дзе публікаваў крытычныя артыкулы, сатырычныя паэмы і вершы, накіраваныя супраць царскай урадавай палітыкі, за што неаднаразова прыцягваўся да суда. Пасля 1917 г. чытаў лекцыі па гісторыі рэвалюцыйнага друку, публікаваў мемарыяльныя нататкі.

**1900** год — нарадзіўся (в. Боркі Слуцкага павета) Кузьма Чорны, беларускі пісьменнік, драматург, публіцыст; стваральнік беларускай сацыяльна-псіхалагічнай і інтэлектуальна-філасофскай прозы. У гэты ж дзень у 1964 годзе ў Цімкавічах (Капыльскі раён) адкрыўся мемарыяльны літаратурны музей Кузьмы Чорнага.

**1925** год — ствараецца Беларуская сялянска-работніцкая грамада — палітычная партыя нашага народа ў Заходняй Беларусі ў міжваеннай Польшчы, якая паслядоўна выступала за дзяржаўную самастойнасць. Самая вялікая партыя 1920-х гадоў у Заходняй Беларусі. Налічвала больш за 2 тысячы гурткоў, якія аб'ядноўвалі каля 120 тысяч членаў. БСРГ утворана на аснове групы прадстаўнікоў беларускай меншасці ў польскім Сейме. Друкаваным органам была газета «Беларуская справа», пазней — «Народная справа».

У свеце

**1945** год — у Маскве на Краснай плошчы адбыўся гістарычны Парад Перамогі савецкіх воінаў у азнаменаванне перамогі над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. У ім бралі ўдзел зводныя палкі франтоў, Наркамата абароны СССР і ВМФ СССР, ваенных акадэмій, вучылішчаў і часці Маскоўскага гарнізона. Прымаў парад Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў, камандаваў парадам Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 936 Індэкс 63850. Зак. № 1316.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 чэрвеня 2025 года.